

З ДЭКРЭТУ – У СВАЮ СПРАВУ

Сямейная газета

ЯК ВЫРАСЦІЦЬ АЖЫНЫ І МАЛІНЫ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ВЕРАСНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 176 (28792)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Апошні дыялог з жыхарамі рэгіёна паказаў, што многія раёны ў рабоце з грамадзянамі дзейнічалі на апярэджанне. У той жа час хачу звярнуць увагу, што кожнае з пытанняў, якія паступілі, неабходна разгледзець дэталёва. Мы абавязаны стварыць нармальныя ўмовы для жыцця людзей. Для гэтага трэба чуць кожнага чалавека, аператыўна вырашаць праблемы, якія хвалююць яго. У тым ліку і з фінансаваннем. Галоўнае — сустрэчы з людзьмі. Трэба праводзіць і апытанні. Бо кожнае нявырашанае пытанне, ад якога ўлада фармальна адпісалася, рана ці позна ўсё роўна вернецца да яе. І чарговы раз акцэнтую ўвагу на неабходнасці ўзаемадзеяння з дэпутацкім корпусам».*

# У гістарычным ракурсе



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Полацкі студэнт Мікіта БРЫЦІКАЎ з маленства захапляецца маляваннем. Нездарма сваёй будучай прафесіяй ён выбраў дызайн вытворчага асяроддзя. Не толькі для залікаў і экзаменаў, але і для асалоды і назапашвання ведаў Мікіта занатоўвае архітэктуру найстаражытнейшага беларускага горада.

## КОРАТКА

- **У гэтым годзе на БМЗ паступіла каля 40 заявак на пракат арматуры новага профілю ад патэнцыйных пакупнікоў з краін ЕС, Афрыкі і Блізкага Усходу.**
- У Беларусі плануецца ўзмацніць абарону правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг.
- **Беларускія навукоўцы распрацоўваюць тэхналогію лячэння пацыентаў з хваробай Паркінсана з дапамогай мезенхімальных ствалавых клетак.**
- У Гродне да 890-годдзя горада з'явяцца сметніцы-джэнтльмены. На іх капелюшах на пяці мовах будзе напісана слова «дзякуй».



- **Пад Светлагорскам у Бярэзіне рыбак злавіў піранню.**

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ПАРТНЁРСТВА

**XIII Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства дзеля будучыні: лічбавы парадак дня для медыяпрасторы» працягвае сваю работу ў Мінску. Учора яго ўдзельнікі — кіраўнікі айчынных і замежных СМІ, сацыёлагі, палітолагі, навукоўцы і медыяэксперты — абмяняліся меркаваннямі ў прафесійных дыскусіях датычна лічбавізацыі медыйнай прасторы і пошукаў новых фармаў, падыходаў і метадаў працы традыцыйных сродкаў масавай інфармацыі.**

Не першы раз адну з самых вялікіх дэлегацый на форуме, які сабраў каля 300 экспертаў медыйнай сферы, прадставіла Расія, таксама вялікі прафесійны дэсант прыбыў з Кітая. Усяго ж удзел у тэарэтычным і практычным абмене журналісцкім вопытам бяруць представнікі амаль 30 краін, у тым ліку Азербайджана, Арменіі, Бельгіі, Італіі, ЗША, Літвы, Манголіі, Сербіі, Украіны, Фінляндыі, Францыі, Эстоніі і іншых.

СТАР. 2

■ Спадчына

# Першая чытанка беларусаў і не толькі

## Чаму мы можам навучыцца па 400-гадовым «Буквары»

**Буквар — важная кніга. Бо менавіта праз яе пачынаецца знаёмства чалавека з іншымі кнігамі, якія ў далейшым ён зможа прачытаць. Аднак у ранейшыя часы такія выданні змяшчалі не толькі алфавіт і спосаб складання літар у сказы, а сказаў у словы. Яго выкарыстоўвалі і для выхавання, і для таго каб зразумець, якое месца чалавек займае ў гэтым свеце, як яму трэба кантактаваць з іншымі людзьмі.**

**Аказваецца (і гэта надзвычай прыемна), што і ў такой справе беларусы аказаліся адными з першых!** «Буквар» выйшаў роўна 400 гадоў таму назад — у 1618 годзе ў друкарні віленскага Святадухаўскага брацтва ў Еўі. Гэта быў новы крок у тагачаснай выхаваўчай і адукацыйнай сістэме. Следам пачалі выходзіць многія іншыя буквары. Беларускі аналаг амаль цалкам ці часткова капіравалі і выдавалі пазней украінцы і расіяне.

Такім чынам, у пэўным сэнсе ў яшчэ адной нашай першакнігі сёлета юбілей.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Дзякуючы падтрымцы многіх зацікаўленых асоб і арганізацый свет пабачыла яе факсімільнае перавыданне. Пра тое, што ўяўляе сабой гэта важная кніга, якім быў яе арыгінал, мы пагутарылі з **намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце, старшынёй Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Алесем СУШАМ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Афіцыйны візіт ва Узбекістан

**Учора распачаўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан. Каля трапа самалёта ў міжнародным аэрапорце імя Іслама Карымава беларускага лідара сустракалі прэм'ер-міністр Узбекістана Абдула Арыпаў, міністр замежных спраў Абдулазіз Камілаў.**

Адразу пасля прылёту ў Ташкент Аляксандр Лукашэнка ўсклаў кветкі да Манумента Незалежнасці і гуманізму і помніка Першаму Прэзідэнту Узбекістана Ісламу Карымаву, паведамляе БелТА.

У Ташкенце сёння кіраўнік дзяржавы правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым, якія пройдуць у вузкім фармаце і пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый. Чакаецца, што бакі асноўную ўвагу ўдзеляць пашырэнню гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, развіццю вытворчай кааперацыі і арганізацыі зборачных прадпрыемстваў па выпуску запатрабаванай ва Узбекістане тэхнікі.

На перагаворах таксама будзе абмяркоўвацца ўмацаванне ўзаемадзеяння па шэрагу напрамкаў — ад прамысловасці і сельскай гаспадаркі да гуманітарнай сферы і турызму. Размова пойдзе аб развіцці рэгіянальнага супрацоўніцтва як эфектыўнага інструмента нарошчвання гандлёва-эканамічных сувязяў. Плануецца, што прэзідэнты абмяняюцца меркаваннямі па актуальных пытаннях рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня.

Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне пакета двухбаковых дакументаў аб пашырэнні супрацоўніцтва ў розных сферах і галінах.

Кіраўнікі дзяржаў плануюць наведаць беларуска-узбекскае прадпрыемства «Амкадор-Агратэхмаш» і выстаўку беларускіх вытворцаў Made in Belarus.

■ Парламенцкі дзённік

# УЛАДУ НА МЕСЦАХ — СЕЛЬСАВЕТАМ!

**Міжнародны круглы стол па актуальных пытаннях мясцовага самакіравання прайшоў у сталіцы. У ім удзельнічалі прадстаўнікі Савета Рэспублікі і Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы (СЕ) з Францыі, Італіі, Нідэрландаў, Грэцыі і Румыніі. Нагадаем, што ў склад кангрэса ўваходзяць 324 прадстаўнікі каля 200 000 адміністрацыйных адзінак 47 краін — удзельніц СЕ. Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі мае статус запрошанага назіральніка.**

На адкрыцці мерапрыемства **старшыня верхняй палаты беларускага парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** звярнуў увагу на асноўныя моманты дыскусіі. «Свет змяняецца вельмі хутка. Ідзе пошук новай канцэпцыі глабальнага развіцця. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў прыярытэт аддаваўся стварэнню інстытутаў глабалізацыі. І гэты перыяд развіцця не быў патрачаны дарма. З'явіліся сацыяльныя дзяржавы, узнікла міжнароднае права, міжнародныя інстытуты, рашэнні якіх носяць наднацыянальны статус. І шмат іншага, што садзейнічае ліквідацыі няроўнасці ў шырокім сэнсе, — падкрэсліў спікер. — Зараз мы бачым новыя з'явы: масавая міграцыя, некаторыя эканамічна развітыя краіны выходзяць з міжнародных дагавораў. На мой погляд, гэтыя сур'ёзныя выклікі патрабуюць удасканальвання парадку дня міжнароднага супрацоўніцтва і новых ініцыятыў нацыянальных урадаў».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што і нам, і гасцям з Еўропы ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго. Ён звярнуўся да шматвяковай гісторыі беларускага самакіравання. Нагадаў, што нашы гарады мелі магдэбургскае права, пэўны вопыт быў пройдзены ў савецкі перыяд, папраўкі ў Канстытуцыю ў 90-я таксама датычыліся органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Разам з тым старшыня Савета Рэспублікі заўважыў: «Патэнцыял прадстаўнікоў, абраных простымі людзьмі ў Саветы дэпутатаў, шматлікія грамадскія арганізацыі, мы выкарыстоўваем недастаткова эфектыўна». Таксама парламентарый расказаў пра перайманне іншаземнага вопыту, у прыватнасці прынцыпаў Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання.

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што дзейнасць верхняй палаты беларускага парламента і кангрэса мае сэнс развіваць у спалучэнні з Мэтамі ўстойлівага развіцця. Ён таксама нагадаў пра Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які мае адбыцца ў кастрычніку ў Магілёве, запрасіў еўрапейскіх калег да ўдзелу.

**Надзея АНІСОВІЧ** ■

*Больш падрабязна пра круглы стол, а таксама пра меркаванні яго ўдзельнікаў чытайце ў заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».*

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ПАРТНЁРСТВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«Праблема лічбавізацыі медыяпрасторы ўзнікла не ўчора і не сёння, проста актуальнасць яе з цягам часу ўсё ўзрастала, і зараз з разраду актуальных яна перайшла ў разрад злабадзённых, — абазначыў прыярытэты сёлетняга форуму яшчэ да пачатку яго работы **першы намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ.** — Гаворка ідзе пра тое, што істотна змяніліся ўмовы, парадыгма журналістыкі: цяпер мала займацца толькі вытворчасцю кантэнту, неабходна ўдзяляць значную ўвагу яго дыстрыбуцыі, засяроджвацца на якасным медыямаркетынгу. Гэтыя пытанні ў шэрагу іншых мы і абмяркоўваем з удзельнікамі медыяфоруму».

**Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** падчас пленарнага пасяджэння прапанаваў пагаварыць таксама пра адказнасць журналіста за ўздзеянне на свядомасць людзей: «Журналістаў часта абвінавачваюць у спробах маніпуляваць грамадскай свядомасцю, у нас бачаць арганізатараў інфармацыйных войнаў. Можа быць, усё значна прасцей і журналісты ўсяго толькі шукаюць праўду, імкнуцца хоць бы на словах, якія выказаны ў інтэрнэце, агучаны ў тэлеэфіры ці напісаны ў друкаваных выданнях, выбудаваць дарогу ад рэальнай рэчаіснасці да ідэалу жыццёвага ўладкавання?..» Міністр нагадаў, што пяць месяцаў таму Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў тэлевізійным эфіры звярнуўся да ўсіх беларускіх СМІ са словамі пра тое, што задача журналістаў — фарміраваць канструктыўную грамадскую думку, весці аб'ектыўны, узважаны і ўдумлівы дыялог з аўдыторыяй. «Таму давайце спрачацца, выказваць розныя меркаванні тут, на дыскусійных пляцоўках нашай міралюбівай краіны — спрачацца з разуменнем таго, што мы паважаем свабоды і каштоўнасці дэмакратычнага грамадства, — заклікаў міністр. — Калі вы штосьці падкажаце нам у тэхналогіях, інструментарыі журналіста — мы, са свайго боку, будзем толькі ўдзячныя. Калі, вярнуўшыся дадому, праз свае СМІ вы пашырыце ўяўленне шырокай аўдыторыі пра стваральныя працэсы, якія ідуць у Рэспубліцы Беларусь, паверце — у нас вы знойдзеце сапраўдных сяброў і добрых інфармацыйных партнёраў».



Фота БелТА.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ зачытаў прывітанне кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам медыяфоруму.**

Пра неабходнасць прафесійнай кансалідацыі так ці інакш гаварылі практычна ўсе ўдзельнікі форуму. «Свет сёння занадта складаны, каб дзяліць яго на Усход і Захад, Поўдзень і Поўнач, — мяркуе **генеральны дырэктар расійскай Тэлевізійнай службы навін Аляксандр ГУРНОЎ.** — Таму задача нашага медыяфоруму — не падзел на фракцыі, а пошук і распрацоўка той агульнай прафесійнай і наогул культурнай прасторы, у якой мы можам супрацоўнічаць і адказваць на сучасныя выклікі». А **намеснік дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Аляксей КУБРЫН** дадаў, што не трэба проціпастаўляць традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі і сацыяльныя медыя, калі можна знайсці пункты судакранання і агульныя інтарэсы з імі. Адным з важных пунктаў такога партнёрства спадар Кубрын назваў вывучэнне блогасферы і ўзаемадзеянне з ёй.

Наколькі паспяховым можа быць такое супрацоўніцтва, расказала **галоўны рэдактар партала Cozaripress Яніна КОЗАРЫ з Бельгіі,** якая прывяла наступны прыклад: у Антверпене ёсць сайт для дзяцей, які робяць па заказе дзяржавы дарослыя — журналісты і блогеры, — і ў простай і цікавай форме яны расказваюць як мясцовыя навіны, так і важныя падзеі сусветнага маштабу. Акрамя таго, бельгійскіх школьнікаў запрашаюць на фестываль блогераў і ютубераў, які таксама праходзіць пры падтрымцы дзяржавы ў якасці інвестыцыі ў блізкую будучыню.

## ПЛЮС ЦІ МІНУС?

Далёка не ўсе бачаць у лічбавізацыі медыяпрасторы праблему. Так, **першы намеснік старшыні Выканкама — выканаўчага сакратара СНД Віктар ГУМІНСКІ** перакананы, што лічбавы парадак дня, наадварот, адкрывае новыя магчымасці і стварае безбар'ернае інфармацыйнае асяроддзе, у прыватнасці, для ўзаемадзеяння нашых краін ва ўсіх сферах дзейнасці СНД.

**Дырэктар Азіяцка-еўрапейскага бюро інфармацыйнага агенцтва «Сіньхуа» Фан ВЭЙГО** прывёў канкрэтныя вынікі развіцця лічбавага сегмента ў традыцыйных СМІ і ўразіў гасцей і ўдзельнікаў форуму лічбамі: толькі англамоўная мабільная праграма партала навін Xinhua news (а партал на сёння ўваходзіць у топ-100 найбуйнейшых інфармацыйных сайтаў у свеце) быў спампаваны ўжо больш як 200 тысяч разоў па ўсім свеце. Сотнямі тысяч карыстальнікаў вымяраецца і колькасць падпісчыкаў агенцтва ў сацыяльных сетках — і ўсё гэта, заўважае спадар Вэйго, толькі частка вялікай стратэгіі развіцця.

Праўда, нагадваюць эксперты, гонка за «лічбай» — справа хоць і жыццёва неабходная ў сучасным свеце, аднак вельмі нятанная. Як прызнаўся **галоўны рэдактар «Комсомольской правды» Уладзімір СУНГОРКІН,** на падтрыманне сайта выдання выдаткоўваецца больш за мільярд расійскіх рублёў у год. Але і вынік таго варты: штодня сайт наведвае каля чатырох мільёнаў чалавек. «Мы жывём у эпоху вялікіх лічбаў і вялікіх медыя, і гэта трэба мець на ўвазе, калі мы абмяркоўваем далейшы лёс медыя. Практычна штодня ў мяне цікавяцца: які лёс чакае папяровыя СМІ? Ніхто гэтага дакладна не ведае. Калі захаваецца грашовая падтрымка, то, напэўна, і колькасць папяровых СМІ павялічыцца — але, з іншага боку, назіраецца пастаянны адток рэкламы, а значыць, і прыбыткаў папяровых газет», — разважае рэдактар аднаго з самых высокатыражных расійскіх выданняў. Але ён нагадаў і пра адваротныя выпадкі — так, калі ў Расіі шырока абмяркоўвалася пенсійная рэформа і неабходна было патлумачыць даступнай мовай і вялікаму чытацкаму колу афіцыйныя дакументы, з гэтым лепш справіліся якраз традыцыйныя папяровыя выданні, тыраж якіх значна вырас.

У Беларусі ж на сёння, адзначае **кіраўнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ прафесар Давід РОТМАН,** да 95 % моладзі і да 50 % людзей сталага веку атрымліваюць інфармацыю праз інтэрнэт. Але гэта не прысуд традыцыйным СМІ, сцвярджае навуковец: «Перавага лічбавых медыя — у аператыўнасці, магчымасці даць інфармацыю практычна імгненна, але традыцыйныя СМІ могуць і павінны пагледзець на яе ў іншым ракурсе, прааналізаваць больш падрабязна і глыбока».

Перспектывы для развіцця друкаваных СМІ бачыць і **дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Арменпрэс» Арам АНАНЯН:** «Мы жывём у новай экасістэме, перанасычанай інфармацыяй, і спажыўцы ўжо не хочуць пасіўна чакаць навін, а жадаюць атрымліваць іх у рэжыме «тут і цяпер». Аднак я ні ў якім выпадку не раблю прагнозу, быццам у папяровых сродкаў масавай інфармацыі няма будучыні. Наадварот, адкрываюцца новыя, вельмі цікавыя магчымасці — напрыклад, праз выкарыстанне QR-тэхналогій, якія дазваляюць газетам трапіць у лічбавы свет».

## НЕ ВЫПУСЦІЦЬ ДЖЫНА З БУТЭЛЬКІ

Масавае распаўсюджанне фэйкавых навін і злоўжыванне сацыяльнымі медыя для прасоўвання правакацыйнай інфармацыі, якая ўносіць разлад у грамадства, парушэнне нормаў этыкі, замаскіраваныя спробы распаліць «інфармацыйныя войны» — гэта той адваротны бок медаля лічбавізацыі медыяпрасторы, пра які нельга забываць і які трэба ўлічваць у паўсядзённай працы журналіста, пра што таксама многа, горача і грунтоўна гаварылі ўдзельнікі форуму цягам усяго дня.

«Калі ў краіне не будуць развівацца інфатэхналогіі, яна будзе адставаць ад іншых у развіцці. Аднак мы ні ў якім выпадку не павінны падпарадкоўвацца лічбаваму джыну, які сёння практычна захапіў свет, і дазваляць яму дыктаваць умовы, — рэзюмуе **прафесар Еўраакадэміі, палітолаг, доктар філасофскіх навук Эдуард ЦІН з Эстоніі.** — Мы павінны быць вышэй за джына і кіраваць ім». Дзеля гэтага, лічыць эксперт, трэба не гвалтоўна змагацца з лічбавізацыяй усіх сфер жыцця, а ўмела кіраваць ёю і скарыстоўваць усё лепшае, што даюць сучасныя тэхналогіі: дзецям — запампоўваць у гаджэты развівальныя праграмы, маладым людзям, якія масава «сядзяць» у сацыяльных сетках — дапамагаць рэалізоўваць праз інтэрнэт-суполкі грамадска значныя ініцыятывы, а традыцыйным СМІ — нястомна нагадваць, што ніякія самыя сучасныя прылады і лічбавыя тэхналогіі не заменяць «каркас» — добрую адукацыйную базу, на якую трэба нанізваць новыя навыкі і ўменні.

...Сёння Беларускі міжнародны медыяфорум прадоўжыць сваю работу ў Летняй школе журналістыкі, дзе навукоўцы, даследчыкі і прадстаўнікі вядучых СМІ правядуць майстар-класы і лекцыі для маладых журналістаў. Таксама госці з розных краін спрычыняцца да Года малой радзімы, абвешчанага ў нашай краіне, праедуць з экскурсіяй па Мінску і наведаюць шэраг аб'ектаў агратурызму ў Мінскай вобласці, у тым ліку парк-музей інтэрактыўнай гісторыі «Сула».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Запрашальнік

# Усе затанчаць у карагодзе

**У Гомель пачалі з'язджацца ўдзельнікі ІХ Міжнароднага фестывалю «Сожскі карагод». Ён праводзіцца раз на два гады і традыцыйна аб'яднаны з Днём горада.**



Галоўны рэжысёр фестывалю «Сожскі карагод» Пётр СВЯРДЛОЎ і скульптар Уладзімір АНДРЫЯНАЎ з бронзавай балерынай.

Фота Ганны ПАШЧАНКІ.

Для ўдзелу ў трохдзённым харэаграфічным марафоне заявіліся больш 30 калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Сербіі і Кітая. Конкурсная праграма запланавана на пятніцу і суботу, расказаў **галоўны рэжысёр фестывалю Пётр СВЯРДЛОЎ:**

— Фестываль абяцае стаць вельмі насычаным. Будуць ацэньвацца народна-сцэнічныя, эстрадныя, фальклорна-побытавыя танцы, сучасная харэаграфія, балетмайстарскія работы. Традыцыйна пройдзе і Міжнародны турнір па бальна-спартыўных танцах на Кубак Гомеля «Залатая Рысь».

Судзіць выступленне прафесіяналаў у розных намінацыях будзе міжнароднае журы, у якое ўвайшлі прадстаўнікі Расіі, Польшчы, Малдовы і Украіны на чале з вядомым беларускім балетмайстрам Святланай Гуткоўскай.

Гамяльчане змогуць стаць гледачамі выступленняў славутых калектываў. Такіх, як Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі, Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, Нацыянальны акадэмічны ўкраінскі народны хор імя Р. Вяроўкі, ансамбль «Песняры», вядучыя салісты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

Бронзавая скульптура дзяўчынкі-балерыны ў гэтыя дні будзе ўстаноўлена каля дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў Гомеля. У ролі мадэляў для скульптара Уладзіміра Андрыянава выступалі выхаванкі гэтай установы.

Абяцаюць, што сапраўды грандыёзным стане шоу на стадыёне «Цэнтральны». У пастаноўцы будзе задзейнічана каля 1800 чалавек. Юныя артысты дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў, каледжа імя Н. Сакалоўскага, гарадскіх школ мастацтваў і ўніверсітэтаў праводзяць цяпер апошнія рэпетыцыі. Галоўны рэжысёр фестывалю Пётр Свярдлоў гаворыць, што ўдзельнікі цырымоніі адкрыцця паспрабуюць расказаць пра тое, як цяперашні час уздзейнічае на іх жыццё і на развіццё харэаграфічнага мастацтва.

Пасля конкурсу ўсе калектывы выступяць на вуліцах Гомеля, у тым ліку на адкрытых пляцоўках. Дарэчы, гамяльчанам будзе што паглядзець і акрамя танцаў. Каля двух дзясяткаў святочных пляцовак — гэта яшчэ і выстаўкі, інтэрактыўныя і фотазоны. Каля скульптуры Лодачніка на набярэжнай Сожа пройдзе гастранамічны фестываль.

У нядзелю, 16 верасня, ушануюць пераможцу «Сожскага карагода». Гран-пры, між тым, уяўляе сабой знак фестывалю, зроблены з каштоўных металаў. Пасля цырымоніі ўзнагароджання адбудзецца гала-канцэрт пераможцаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Футбол. Ліга нацый

# НЕ САМЫ ДРЭННЫ ВЫНІК?

## Зборныя Беларусі і Малдовы згулялі ўнічыю ў матчы другога тура

**Сустрэча на стадыёне «Зімбру» ў Кішынёве так і засталася без забітых мячоў — 0:0. Хоць адкрыць лік мелі шанцы абедзве каманды. Калі ў першым тайме ініцыятыва была на баку гаспадароў, то ў другім беларусы перахапілі перавагу ў валоданні мячом.**



*— Гульня была з пераменным поспехам: момантамі гаспадары валодалі ініцыятывай, момантамі мы,* — каментуе матч **галоўны трэнер зборнай Беларусі Ігар КРЫВУШЭНКА.** *— Адчуваліся напружанне, адказнасць: гульня была да мяча, але, на жаль, забіць яго не ўдалося. Атакуючыя дзеянні не зусім атрымаліся ў нас, таму вынік заканамерны. Мне падалося, што ў першым тайме хлопцы былі зацiснутыя, я папрасіў, каб яны трошкі расслабіліся, асабліва ў зоне атакі. Сказаў, каб злавілі кураж, правялі ўзаемадзеянні, над якімі працавалі. Магчыма, гэтыя словы іх трошкі разнявалілі. Нічыя на выездзе — гэта не самы дрэнны вынік. Наколькі я ведаю, зборная Малдовы таксама ставіць задачу выхаду далей. Усё яшчэ залежыць ад нас: гуляць дзве гульні з Люксембургам, Малдовай, Сан-Марына. Усё яшчэ ў нашых руках,* — зазначыў настаўнік.

У той жа вечар у групе 2 дывізіёна D каманда Люксембурга ўпэўнена перайграла Сан-Марына — 3:0 і з шасцю ачкамі ўзначаліла турнірную табліцу. Трэці тур у Лізе нацый адбудзецца 12 кастрычніка, зборная Беларусі згуляе ў гэты дзень дома з Люксембургам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Здарэнні

# Да берага мужчыну цягнулі падлеткі

**Увечары службе ратавання паведамілі, што на рацэ Цітаўка ў Мар'інай Горцы тоне чалавек.**

— Да прыбыцця нашых падраздзяленняў два хлопцы, якія лавілі рыбу, кінуліся на дапамогу грамадзяніну. Той знаходзіўся ў 20 метрах ад берага. Падлеткі дацягнулі яго на 10 метраў да сушы, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Ратавальнікі на месцы выявілі, што на глыбіні аднаго метра ў ціне і чароце знаходзіцца мужчына, які самастойна выбрацца не мае сіл. Грамадзяніна 1951 года нараджэння выцягнулі і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пацярпелага шпіталізавалі з папярэднім дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» ў Мар'інагорскую цэнтральную раённую бальніцу.

# Альтанку спалілі дзеці?

**На тэрыторыі аўтадрома ў вёсцы Вялікія Карнышы Навагрудскага раёна згарэла альтанка.**

Драўляная пабудова памерам 4х4 метры была цалкам знішчана. Ратавальнікі не дапусцілі распаўсюджвання полымя на гаспадарчыя пабудовы, размешчаныя на суседнім падворку. Як мяркуецца, да ўзгарання прывяло свавольства мясцовых хлапчукоў 2010 і 2013 гадоў нараджэння. У выпадку датычнасці дзяцей да здарэння іх бацькам давядзецца пакрыць шкоду, а юныя падпальшчыкі будуць пастаўлены на ўлік, паведамілі ў МНС.

Дарэчы, за восем месяцаў у Гродзенскай вобласці адбылося 17 пажараў з-за дзіцячага свавольства. На шчасце, абышлося без чалавечых ахвяр. Бацькам ратавальнікі рэкамендуюць звяртаць асаблівую ўвагу на тое, з чым гуляюць дзеці, бо да бяды, бывае, адзін крок.

# Канфіскавалі 84 скруткі з псіхатропам

**Супрацоўнікі наркакантролю Маскоўскага РУУС сталіцы па падазрэнні ў незаконным абароце наркотыкаў затрымалі беспрацоўнага мінчаніна 1995 года нараджэння. Зроблена гэта было падчас вышуку асоб, якія займаюцца збытам наркотыкаў і псіхатропаў праз тайнікі-закладкі.**

Малады чалавек быў затрыманы па месцы жыхарства, паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама. Тут аператыўнікі знайшлі і канфіскавалі 84 скруткі з забароненымі рэчывамі: больш за 60 грамаў парашкападобнага рэчыва светлага колеру, якое па заключэнні эксперта змяшчае асабліва небяспечны псіхатроп альфа-PVP, а таксама каля 90 грамаў здробненага рэчыва расліннага паходжання, якое таксама змяшчае псіхатропнае рэчыва (курыльная сумесь).

Супрацоўнікі наркакантролю ўстанавілі, што малады чалавек працаваў закладчыкам на інтэрнэт-краму па збыце наркотыкаў каля двух месяцаў. У яго абавязкі ўваходзіла збіраць закладкі з псіхатропам і размяшчаць іх у тайніках па ўсім Мінску. Сам ён таксама ўжываў забароненыя рэчывы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўрасаюз вырашыў пакараць Венгрыю

Еўрапарламент упершыню ў гісторыі запусціў працэдуру пакарання ўрада адной з краін ЕС — Венгрыі — за парушэнне прынцыпу падзелу ўлад, ушчамленне палітычных свабод і карупцыю. 448 дэпутатаў Еўрапейскага парламента выступілі за ўжыванне пакарання, 197 выказаліся супраць і 48 устрымаліся. Такім чынам, Еўрапарламент задзейнічае палажэнні артыкула 7 Дагавора аб Еўрапейскім саюзе. Ён дазваляе прыпыняць дзеянне некаторых правоў краіны — члена Еўрасаюза. Венгерскі прэм'ер-міністр Віктар Орбан, выступаючы ў дэбатах па дакладзе і рэзалюцыі Еўрапарламента, абвінаваціў еўрадэпутатаў у тым, што яны хочуць пакараць яго краіну за барацьбу супраць іміграцыі і за тое, што сам Орбан называе абаронай хрысціянскіх каштоўнасцяў. Апаненты прэм'ера запярэчылі яму, што ў дакладзе Еўрапарламента аб сітуацыі ў Венгрыі гаворыцца пра замахі на незалежнасць судовай улады, ушчамленні свабоды прэсы, а таксама пра злоўжыванні пры размеркаванні грантаў Еўрасаюза.

## Брытанскія кампаніі ствараюць запасы імпартных тавараў на выпадак «жорсткага» брэксіту

Брытанскія кампаніі могуць стварыць запасы імпартных тавараў агульным аб'ёмам каля 40 млрд фунтаў стэрлінгаў (52 млрд долараў) на выпадак рэалізацыі «жорсткага» сцэнарыя брэксіту — выхаду Вялікабрытаніі з ЕС без новага гандлёвага пагаднення паміж бакамі. Стварэнне запасаў дадасць 0,5 працэнтнага пункта да тэмпаў росту ВУП Вялікабрытаніі за тры кварталы да моманту брэксіту 29 сакавіка 2019 года, лічаць у CEBR. Аднак чаканае зніжэнне попыту ўслед за гэтым, як мяркуецца, адбярэ столькі ж ад росту брытанскага ВУП на працягу астатняй часткі 2019-га.

«Такім чынам, міні-рэцэсія пасля брэксіту з'яўляецца амаль непазбежнай», — расказаў заснавальнік CEBR Дуглас МакУільямс газеце The Financial Times. Найбольш значнымі, паводле ацэнак экспертаў, будуць ваганні запасаў сыравінных тавараў, уключаючы сыравіну для хімічнай прамысловасці і розныя руды, а таксама прамежкавых тавараў, у тым ліку кампанентаў для аўтамабіляў і самалётаў.

## У Аўстраліі знайшлі велізарныя залатыя самародкі. Вага найбуйнейшага — амаль 100 кг

У Заходняй Аўстраліі шахцёры выявілі два велізарныя камені з багатымі ўкрапленнямі залатой пароды. Кожны з гэтых камянёў каштуе, паводле першых і самых прыблізных ацэнак, мільёны долараў. У самым вялікім, ён важыць 95 кілаграмаў,



змяшчаецца каля 2400 унцый золата (гэта больш за 70 кг), паведамілі ў здабыўной кампаніі RNC Minerals. У кампаніі ўдакладнілі, што на мінулым тыдні з шахты паблізу Калгурлі ўдалося здабыць золата на суму каля 11 мільёнаў долараў. Знаходку шахцёраў ацэньваюць як вельмі рэдкую.

«Людзі ўсё яшчэ выяўляюць самародкі на тэрыторыі залатых капальняў, але звычайна яны важаць усяго некалькі унцый», — сказаў прафесар Сэм Спірынг, кіраўнік аўстралійскай горназдабыўной школы ва ўніверсітэце Керцін. Золатаздабытчыкі ацанілі большы з камянёў прыблізна ў тры мільёны долараў, а другі самародак вагой 63 кілаграмы (у ім 1600 унцый золата) — у 1,9 мільёна долараў.

# Першая чытанка беларусаў і не толькі

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— Наш «Буквар» пазіцыянуецца як першы ў сваім родзе. Растлумачце, што маецца на ўвазе.***

— «Буквар» сапраўды ўнікальны і непаўторны. Але, натуральна, гэта не першая ў свеце кніга для навучання. Да і пасля таго існавалі іншыя кнігі. У лацінскай традыцыі быў «Абэцэдарый». Існавалі так званыя «Хорнбукі» — літары для навучання запісваліся на васковых ці рогавых таблічках. Былі і іншыя друкаваныя тэксты для навучання.

***— Вы казалі, што выданне распачало прынцыпова новую традыцыю асветы.***

— Па-першае, гэта традыцыя самога найменне «Буквар». Раней аналагічныя не існавалі ці былі пад зусім іншымі найменнямі. Нават у рукапісных зборніках такое слова нідзе не сустракаецца — мы бачым першае яго ўжыванне. Па-другое, гэта зборнік новага зместу, якога раней не было, — ён з'явіўся дзякуючы працы віленскіх манахаў. Кніга ўнікальная і паводле зместу, бо абагульніла адукацыйныя набыткі папярэднікаў з алфавітам, правіламі навучання (складання літараў у склады, складоў у словы, слоў у сказы).

**«Беларусь зрабілася цэнтрам адукацыйнай дзейнасці ў рэгіёне. У нас у канцы XVI — пачатку XVIII стагоддзя выйшла больш «Буквароў», чым на тэрыторыі Украіны і Расіі разам узятых, прычым у некалькі разоў больш».**

У далейшым таксама і правілаў граматыкі. Усё гэта дадалося да вялікага комплексу адукацыйна-выхаваўчых тэкстаў, якія на канец XVI стагоддзя склаліся ў адно цэлае. Лаўрэнцій і Стафан Зізанії ўжо падрыхтавалі цэлы шэраг «азбукавальных» тэкстаў, прызначаных для навучання. Гэты «Буквар» абагульніў усе дыдактычныя напрацоўкі розных хрысціянскіх традыцый — і заходніх, і ўсходніх — напрацоўкі розных школ Вялікага Княства Літоўскага (мясцовай традыцыі) і вялікі пласт духоўнай традыцыі, заснаванай на біблійных, у першую чаргу новазапаветных, тэкстах. У выніку нарадзілася гэта кніга — вельмі незвычайная, нетыповая, прызначаная шырокай аўдыторыі. Яна пабачыла свет за год да «Граматыкі» Мялеція Сматрыцкага і фактычна з'яўлялася ўступам да яе, бо была разлічана не толькі на навукоўцаў, якія маглі прафесійна напісаць тэксты на царкоўнаславянскай мове, а нават на пачаткоўца — таго, хто толькі приступае да вывучэння мовы. Гэта было прынцыпова новым і важным.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Хто з'яўляецца аўтарам «Буквара»?***

— У мяне ёсць толькі гіпотэза наконт гэтага, бо аўтарства не абазначана. На тытульным лісце напісана, што гэта «буквар языка славенского, писанию, читанию, научению хотящих полезное руководжение...» Пазначана таксама, што кнігу рыхтавалі манахі віленскага манастыра. Атрымліваецца, што гэта калектыўная праца. Фактычна віленскі Святадухаўскі манастыр — галоўны цэнтр адукацыі і асветы праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім (кажучы сучасная мовай, метадычны цэнтр). Больш на кнізе мы не бачым ніякіх імёнаў, акрамя змешчанага на тытуле герба Багдана Агінскага, падкаморыя троцкага, аднак ён з'яўляўся спонсарам, а не аўтарам. Таму, мяркую, што кнігу склалі манахі. Аднак былі задзейнічаны найбольш здольныя сярод іх — Мялецій Сматрыцкі і Лявонцій Карповіч. Першы да таго часу ўжо вучыўся ў многіх універсітэтах Еўропы, быў актыўным практыкам, бо выкладаў многім шляхецкім родам. А Лявонцій Карповіч, на маю думку, таксама з'яўляецца не менш магчымай асобай, якая магла б стаць аўтарам «Буквара». Ён меў цудоўную адукацыю, займаўся практыкай выкладання — кіраваў брацкай школай пры тым самым манастыры. Да таго ж кіраваў друкарняй, працаваў з братамі Зізаніямі, якія да таго выдавалі «Азбуку», меў вялікі досвед знаёмства з навучальнай літаратурай заходняй традыцыі. Таму ён меў усе падставы стаць аўтарам «Буквара». Абодва гэтыя чалавекі — асобы надзвычай яркія для беларускай культурнай прасторы таго часу.

***— Дзе захоўваюцца арыгіналы выдання?***

— Адна з кніг знаходзіцца ў бібліятэцы Мідл Тэмпл у Вялікабрытаніі, другая — у Каралеўскай бібліятэцы Даніі. Дацкі экзэмпляр крыху лепш захаваны, у ім добра чытаюцца ўсе тэксты. Але ён няпоўны, там адсутнічаюць апошнія старонкі «о знамении крестном». Таму мы арыентаваліся ўсё-такі на лонданскі экзэмпляр.

***— Якім грамадскім слаюм была адрасавана кніга і наколькі ўплывала на развіццё асветы (быць можа, закранала толькі вышэйшыя слаі)?***

— Выхад такой кнігі з'явіўся выключна важнай падзеяй. Ён масава паўплываў на свядомасць людзей, не толькі шляхты, духавенства і дваранства, якія мелі магчымасць адукацыі праз манастырскія бібліятэкі, але і найперш на шырокія колы свецкага грамадства і, што важна, гараджан. Гэтыя кнігі пашыраліся на брацкіх школах — і далей, шырэй. Яны выкарыстоўваліся для прыватнага хатняга навучання. У далейшым, як відаць, многія больш позния выданні, напрыклад выданні Спірыдона Собаля, таксама больш позняя кнігі з друкарняў у Магілёве, Куцейне, Вільні, Супраслі пераняли назву, структуру, змест выдання. Яны адно за адным паўтаралі «Буквар», выходзілі амаль кожны год — і гэта стала пэўным культурным выбухам. Фактычна Беларусь зрабілася цэнтрам адукацыйнай дзейнасці ў рэгіёне. У нас у канцы XVI — пачатку XVIII стагоддзя выйшла больш «Буквароў», чым на тэрыторыі Украіны і Расіі разам узятых, прычым у некалькі разоў больш. Гэта традыцыя моцна паўплывала і на культуру, адукацыю Расіі і Украіны, бо ў далейшым падобныя кнігі пачалі з'яўляцца там — пад такой жа назвай і падобным зместам.

***— Выданне было разлічана на дзяцей ці дарослых?***

— Калі сёння па букварах вучацца пераважна дзеці, то ў той час і дарослыя таксама часта не ўмелі чытаць — таму гэта кніга была прызначана і для іх таксама — на ўсіх, хто хоча навучыцца. Аднак у ёй шмат тэкстаў, арыентаваных менавіта на юнакоў, — і гэта сведчыць пра тое, што прызначалася яна найперш ім.

**«Буквар» абагульніў усе дыдактычныя напрацоўкі розных хрысціянскіх традыцый — і заходніх, і ўсходніх — напрацоўкі розных школ Вялікага Княства Літоўскага».**

***— У кнізе шмат рэлігійных тэкстаў. Гэта прыкмета часу?***

— Так, але ў той жа час і свядомая пазіцыя складальнікаў. Задачай «Буквара» было не толькі навучыць складваць літары ў словы і завучыць самі словы, але і засвоіць пэўныя правілы жыцця ў грамадстве. Навучыць чалавека правільна сябе паводзіць, адчуваць і разумець, у чым розніца паміж дабром і злом. Таму сапраўды больш за палову аб'ёму кнігі складаюць малітвы, запаветы, законы, пералікі дабрадзейнасцяў і грахоў. Розныя дабрадзейнасці не толькі пералічваюцца, але і апісваюцца, робяцца спасылкі на Свяшчэннае Пісанне. Дзеці вучылі не «мама мыла раму» — яны даследавалі, хто яны ёсць у гэтым свеце і як сябе трэба паводзіць з іншымі, як быць выхаваным, адукаваным, культурным чалавекам. Мэтай «Буквара» было не проста навучыць чытаць, але навучыць чытаць добрыя тэксты.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Ведай нашых!

## «ЗАЛАТАЯ» ІНФАРМАТЫКА

### Беларусы бліскуча выступілі на міжнароднай алімпіядзе

**Інтэлектуальныя спаборніцтвы праходзілі ў Японіі і сабралі больш як 900 удзельнікаў з 88 краін свету. На працягу двух дзён ім неабходна было вырашыць тры заданні і на іх базе распрацаваць пэўную праграму.**

Гонар беларускай школы адстойвалі не выпускнікі, якія атрымалі гэта права сёлета на рэспубліканскай алімпіядзе па інфарматыцы сярод вучняў. Першакурснікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ заваявалі ў Японіі ўзнагароды рознай вартасці. Залатым прызёрам стаў Аляксандр Кернажыцкі, выпускнік гімназії № 2 г. Магілёва, а сярэбраным — Станіслаў Ціцянок, які скончыў гомельскую гімназію № 5.

Таксама «золата» прынёс камандзе выпускнік лунінецкай сярэдняй школы № 2 Андрэй Некрашэвіч. А выпускнік віцебскай гімназії № 1 Марк Карнейчык стаў сярэбраным прызёрам.

Гэта найлепшы вынік беларусаў за ўвесь час іх выступленняў на міжнародных алімпіядах па інфарматыцы, што дазволіла заняць чацвёртае каманднае месца, падзяліўшы яго са зборнай Расіі. Першае месца — у зборнай Кітая.

Беларускія школьнікі ўдзельнічаюць у міжнародных алімпіядах па інфарматыцы з 1990 года і кожны год вяртаюцца з узнагародамі. Беларус Генадзь Караткевіч станавіўся абсалютным рэкардсменам спаборніцтваў. Ён пабываў на міжнароднай алімпіядзе сем разоў і заваяваў шэсць залатых і адзін срэбраны медаль. Сёння ён навучаецца ў Санкт-Пецярбургу.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# Чырвоны Крыж дапамагае дзецям з цяжкім лёсам

**Дабрачынная акцыя «Дзеці ідуць у школу» прайшла ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх у Мінску.**

Арганізатарамі акцыі выступіла Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Удзел у мерапрыемстве прынялі і прадстаўнікі адміністрацыі Маскоўскага раёна.

Сутнасць акцыі ў тым, што пачатак новага навучальнага года распаўсюджваецца на ўсіх дзяцей адпаведнага ўзросту. У тым ліку і на тых, хто воляй лёсу апынуўся ў прыёмніку-размеркавальніку. Таварыства Чырвонага Крыжа сумесна з уладамі горада вырашыла падтрымаць у падлеткаў жаданне вучыцца. Для гэтага прадстаўнікі таварыства і ўлады прыйшлі ў госці са сваімі падарункамі.

У прывітальным слове **кіраўнік спраў адміністрацыі Маскоўскага раёна Уладзімір КАЗЛОЎСКІ** сказаў выхаванцам прыёмніка-размеркавальніка:

— Хоць вы і трапілі ў гэтую ўстанову, вы дзеці нашай краіны, і для вас пачынаецца самы звычайны навучальны год. Хочацца, каб у вашым жыцці ўсё склалася добра. Каб вы вярнуліся ў сем'і, выправіліся і сталі паўнавартаснымі грамадзянамі.

**Інэса РАВІНСКАЯ, старшыня Маскоўскай раённай арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа,** заўважыла:

— Жадаю, каб усё ў вас склалася ўдала, каб вы больш не траплялі ў падобныя ўстановы. Хацелася б, каб вы проста вучыліся, развіваліся, раслі. А для таго каб падняць настрой, мы прынеслі салодкія падарункі, зробленыя рукамі нашых валанцёраў.

Затым падарункі ад Чырвонага Крыжа і адміністрацыі Маскоўскага раёна раздалі выхаванцам. У вялікіх белых пакетах былі неабходныя канцылярскія прыналежнасці, а таксама розныя ласункі, якія, несумненна, палепшаць ім няпростыя будні.

Па словах **начальніка прыёмніка-размеркавальніка падпалкоўніка міліцыі Ларысы ЛЫЧКОЎСКАЙ,** цяпер ва ўстанове знаходзяцца восем дзяцей, сярод іх адна дзяўчына. Падлеткі ўтрымліваюцца тут да 30 дзён, пасля чаго іх развозяць па месцах пастаяннага знаходжання. Навучальны працэс у прыёмніку-размеркавальніку падтрымліваецца. З дзецьмі займаюцца выхавальнікі з вышэйшай адукацыяй. Установа мае ўсе неабходныя падручнікі, забяспечана выдатнай бібліятэкай. Выхаванцы не выпадаюць з навучальнага працэсу: пішуць сачыненні, вывучаюць гісторыю, замежныя мовы, шмат чытаюць.

Дарэчы, дзеці сюды паступаюць адусюль. Сёння, напрыклад, тут утрымліваюцца жыхары Ліды, Магілёва, Бабруйска, Століна. Ёсць нават падлетак з В'етнама Фан, або, як яго ахрысцілі нашы хлопцы, Ваня. Ён прыехаў са сваёй дзяўчынай у Расію на чэмпіянат свету па футболе. Калі чэмпіянат скончыўся, Фан разам з сяброўкай спрабаваў нелегальна трапіць у Еўрасаюз. Пасля затрымання Фан і яго дзяўчына, як непаўналетнія, апынуліся ва ўстанове на Акрэсціна. Дзяўчыне бацькі аплацілі дарогу, і яна вярнулася на радзіму. А вось бацькі «Вані» не знайшлі пакуль грошай на вяртанне сына дадому. Знаходжанне юнага в'етнамца ў нашай краіне зацягнулася. Яго зваротны білет прыйдзецца аплачваць беларускаму боку. Але ўжо ў найбліжэйшы час Фан вернецца ў В'етнам.

Пасля ўручэння падарункаў Інэса Равінская разам са сваёй памочніцай, валанцёркай Дашай, крыху затрымалася ў выхаванцаў. Справа ў тым, што нехта з іх піша вершы, малюе ці займаецца музыкай. Тут хочуць дапамагчы юным талентам, каб яны мелі магчымасць рэалізаваць свае задумы.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# ЁСЦЬ ТАКОЕ СЛОВА

У канцы гэтага тыдня ў Кішынёве пройдзе Сусветны кангрэс сем'яў — міжнародны форум, падчас якога каля 2000 чалавек не менш чым з 50 краін абмяркуюць, якія захады неабходна рабіць у сучасным свеце для захавання сямейных каштоўнасцяў, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, шлюбу і інстытута сям'і наогул. У тым ліку будуць гаварыць і пра традыцыі як адзін з мосцікаў паміж пакаленнямі, што дапамагае помніць, хто мы і адкуль.

«Якія ў вашай сям'і былі ці ёсць традыцыі?» — цікаўлюся ў некалькіх знаёмых. Адна ўжо вельмі дарослая дзяўчынка прыгадала, як бацька абавязкова ладзіў для іх з братам «татаву нядзелю»: раз на тыдзень-другі забіраў гуляць у адзін з гарадскіх паркаў, і так ім разам было хораша, што ўсе ў выніку заставаліся шчаслівыя і задаволеныя — нават мама. Другая сямейная пара расказала, што сваю традыцыю — летнія вандроўкі разам з дзецьмі па Беларусі — толькі ўсталёўвае. Трэцяя сяброўка цяжка ўздыхае: «Традыцыя? Ды працатэрапія на дачных градах: вясной бульбу і буракі пасадзіць, увосень — выкапаць, прычым абавязкова ўсім разам, не важна, колькі кіламетраў табе трэба ехаць да той дачы. І «адкасіць» не атрымаецца, бо сумленне загрызе».

У маіх бацькоў дачы не было, і бабулі ў вёсцы таксама не было. А вось традыцыі былі. Адну з іх — музычную прыборку — я стараюся працягваць ужо і ў сваёй сям'і.

...Субота, раніца — якраз той час, калі можна пакачацца яшчэ трошкі, але на добры толк трэба ўставаць і займацца справамі. Мама ўключае стары прайгравальнік, набыты нейкім цудам яшчэ ў часы татальнага дэфіцыту, і дастае адну з пласцінак. Калі прыбрацца трэба хутка — ну, там, рэчы на паліцах скласці па парадку (вы ведаеце дзяцей, якія робяць гэта добраахвотна?) ды падлогу падмесці і «прабегчы» анучай — гэта пад бадзёрыя запевы Modern Talking. Калі ж на чарзе генеральная прыборка з праціраннем посуду, шкла і пылу ў кніжных шафах — недахоп нашага імпэту кампенсаваў пранікнёны голас Джо Дасэна. Дзякуй, мамачка, з таго часу мы з сёстрамі навучыліся «падсалоджваць» тую ці іншую нудную дамашнюю работу любімымі песнямі. І асабіста я пазнаю шансанье з першых нот, не блытаю «Salut» і «A toi» ды помню, што «Поющие гитары» злізалі свой хіт пра Карлсана з дасэнаўскай «L'Amerique».

З татам была зусім іншая гісторыя. Пасумаваўшы аб неіснуючым дачным участку, які дапамог бы выхаваць у дзецях любоў да зямлі, тата вырашыў навучыць нас не памерці з голаду, калі раптам што, іншым чынам. І браў з сабой у лес — то паасобку, то ўсіх разам. З ягадамі сяброўства склалася добра, а вось «адчуваць» грыбы так, як умее бацька, ні ў кога не атрымлівалася. Затое мы замусолілі ўшчэнт кніжку «Плады і ягады нашых лясоў», звяраючы ілюстрацыі з арыгіналамі, і вывучылі, бадай, залатое правіла грыбніка: «Не ўпэўнены — не бяры!» А галоўным для нас у шматгадзінных блуканнях па гаях і барах было нават не назбіраць кошык ці вядро грыбоў (і потым яшчэ тры гадзіны чысціць іх, ціхенька лаючы ўраджайны сезон), а знайсці ўжо дома «зайчыкаў гасцінчык» — хлеб ці некалькі пер'яў цыбулі, якія здаваліся найсмачнейшымі ў свеце.

Цяпер тата агітуе ўжо ўнукаў выбрацца з ім на «ціхае паляванне». І я, шчыра кажучы, толькі за, нягледзячы на кляшчоў, камароў, мокрыя ногі, поўныя мурашоў ды шышак кішэні і іншыя сюрпрызы, якія дзеці здольныя прыцягнуць нават з гарадскога лесапарку. Бо незалежна ад вынікаў паходу гэта цудоўная магчымасць адкласці гаджэты і пабыць разам, падыхаць празрыстым восеньскім паветрам, паглядзець на дзятлаў ды вожыкаў не скрозь краты вальераў, а зблізу... Ну, і яшчэ гэта — традыцыя, а каштоўнасць яе ў пераемнасці.

А ў вашай сям'і ёсць улюбёныя традыцыі?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

Выпуск № 17 (108)


■ Майстар-клас

# «З ДЭКРЭТУ ВЫЙШЛА Ў СВАЮ СПРАВУ»

**Заснавальніца швейнай майстэрні Вольга Кастузік — пра палёт фантазіі, эканомію, памылкі пачаткоўцаў, сацыяльную адказнасць бізнесу і занятак для душы.**





«Я шыю проста таму, што не магу не шыць: мне падабаецца ствараць новыя цікавыя рэчы, у галаве мноства ідэй, якія хочацца ажыццявіць, — гаворыць кіраўнік сталічнага швейнага каворкінга «На ўсю катушку» Вольга КАСТУЗІК у адказ на пытанне, навошта ёй усё гэта трэба. — Часам шыю нават «у стол», «у сметніцу», толькі каб праверыць, як будзе паводзіць сябе тая ці іншая тканіна; некаторыя рэчы могуць правісець недашытымі ў шафе год ці два, пакуль на мяне зноў не нападзе прага эксперыментатарства. А часам бачу прыгожую тканіну ці гатовую рэч у краме — і хочацца тут жа засесці, паспрабаваць зрабіць гэта самой».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ На адной хвалі

# СУНІЧНАЕ ЖЫЦЦЁ КАЛЯНКОВІЧАЎ

## Калі саюз не толькі сямейны, але і творчы



**Калі знаёмішся з Уладзімірам і Людмілай, разумееш, што гэтую пару звёў сам Бог. Яны як той баян і скрыпка ў вясковым аркестры: адно без другога не ўявіць. Пэўна, няма на Лунінеччыне чалавека, які б не чуў пра іх дуэт. Адныя ведаюць Калянковічаў як мастацкіх кіраўнікоў дзіцячага ўзорнага фальклорнага ансамбля «Сунічка», іншыя — як вясельных музыкантаў. Але ўсе сыходзяцца на думцы, што дзе б яны ні з'явіліся, там дакладна будуць песні, танцы, смех. Ды не абы-якія, а самыя народныя!**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Сацыяльны клопат

# Куды сям'і звярнуцца па падтрымку?

## У Мінску адкрыўся бясплатны пакой для адпачынку і развіцця дзяцей і падлеткаў

**Інтэграцыйны пакой «Святліца» запрацаваў на базе Хрысціянскага сацыяльнага цэнтра. Тут будуць бясплатна аказваць падтрымку шматдзетным сем'ям, бацькам, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю, тым, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Напрыклад, мамы змогуць праканcультавацца са спецыялістамі наконт сваёй жыццёвай сітуацыі ці пакінуць малога на час, каб заняцца ўласнымі справамі.**

— Чаму выбралі гэты цэнтр? Тут створаны ўмовы для людзей з абмежаваннямі. Для пакоя закупілі цацкі, камп'ютары, праектар, каб дзеці маглі адпачываць і развівацца. Плануем супрацоўнічаць з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна, таму што яны больш ведаюць сітуацыю і сем'і, якім патрэбна дапамога, — расказаў **дырэктар дабрачыннага таварыства «Карытас» Мінска-Магілёўскай епархіі брат Андрэй ЖЫЛЕВІЧ.** Праект з'явіўся пры падтрымцы гэтай каталіцкай арганізацыі, а таксама Міністэрства замежных спраў Польшчы. Яшчэ адзін інтэграцыйны пакой некалькі дзён таму адкрыўся ў Магілёве пры парафіі святога Антонія.

Мінчанка Анжаліка Раманейка, якая выхоўвае сына з інваліднасцю, адзначае: падобныя пакоі насамрэч патрэбны. «Большасць мам асаблівых дзетак застаюцца сам-насам са сваёй праблемай, а тут яны могуць разлічваць на маральную падтрымку, выбрацца кудысьці, пакуль дзіця пад наглядам».

Спецыялісты, якія будуць працаваць у пакоі, прайшлі спецыяльныя курсы. Для бацькоў гэта важны фактар: многія баяцца адпускаць малых, бо лічаць, што, акрамя іх, ніхто як след па дзіця не паклапоціцца.

Важнасць падобных праектаў адзначыў **мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ:**

— Моладзь і дзеці, як казаў Ян Павел ІІ, — гэта будучыня свету. Ніхто не нараджаецца злым чалавекам — злачынцамі становяцца. Мы хочам не дапусціць гэтага, выхоўваць дзяцей на духоўных каштоўнасцях, каб людзі жылі ў грамадстве, з якога можна цешыцца.

«Святліца» будзе працаваць з 13 да 17 гадзін па адрасе: Мінск, вуліца Серафімовіча, 19.

Трэба адзначыць, што сем'і, якія аказаліся ў няпростых жыццёвых сітуацыях, могуць таксама атрымаць дапамогу ў тэрытарыяльных цэнтрах па месцы жыхарства.

# Сямейная арыфметыка

## Летась пяць беларусак развяліся ва ўзросце да 18 гадоў

**Нядаўна Белстат апублікаваў «Дэмаграфічны штогоднік». Прыводзім некалькі цікавых лічбаў з жыцця сем'яў у нашай краіне.**

У мінулым годзе ў Беларусі было заключана 66,2 тысячы шлюбаў. З іх 55,3 тысячы — у гарадзе. Для 30 працэнтаў «маладых» гэты шлюб быў не першы.

Ёсць інфармацыя наконт нацыянальнасці жаніхоў і нявест. Вядома, часцей за ўсё у пару выбіраюць грамадзян Беларусі. Але нашы дзяўчаты бяруць шлюб таксама з расіянамі, украінцамі, палякамі, амерыканцамі, немцамі і ізраільцянамі. Хлопцы — з расіянкамі і ўкраінкамі.

Сярэдні ўзрост нявестаў склаў 25,8 года, жаніхоў — 27,9. У паўторны шлюб жанчыны уступаюць у 38 гадоў, а мужчыны — у 41,2. Хапае і тых, хто вырашае стварыць сям'ю пасля 60. Летась у залатым узросце нявестамі сталі амаль тысяча жанчын, а жаніхамі — паўтары тысячы мужчын. Калі думаеце, што рознаўзроставыя шлюбы не пра Беларусь, памыляецеся. Так, восем мужчын за 60 ажаніліся з жанчынамі, якім яшчэ не было 30.

У мінулым годзе зарэгістравана 32 тысячы разводаў. Здаецца неверагодным, але пяці дзяўчатам, якія скасавалі шлюб, не было і 18 гадоў. Кожная сёмая пара развялася пасля больш чым 20 гадоў сумеснага жыцця, а тры працэнты былых мужоў і жонак не змаглі правесці пад адным дахам і года.

Летась у краіне нарадзілася 102,5 тысячы дзяцей. Гэта на 15 тысяч менш, чым у папярэднім годзе. Увогуле нараджальнасць падае другі год запар.

Сярод нованароджаных 80 % — гэта першыя і другія дзеці ў сям'і. На трэцяе малое бацькі адважыліся ў 15 % выпадкаў, а напрыклад, на шостага і наступных — толькі ў 0,6 % выпадкаў.

Першае дзіця беларускі нараджаюць у сярэднім у 26,5 года (для параўнання: у 2000-м гэты паказчык быў 23,3 года). Гараджанкі становяцца мамамі амаль на два гады пазней за вясковак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Пункт гледжання

# «ЦЯЖКІЯ»... ДАРОСЛЫЯ

## Каго найперш ратаваць — гора-бацькоў ці іх дзяцей?

**Хто яны — абвязаныя асобы, і чаму яны выклікаюць заклапочанасць у кіраўнікоў арганізацый? Абавязанымі лічацца асобы, у адносінах да якіх уступіла ў законную сілу рашэнне суда аб спагнанні расходаў, панесеных дзяржавай на ўтрыманне іх дзяцей, якія знаходзяцца ці знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні.**

Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у праблемных сем'ях», абавязаныя асобы павінны працаваць і штомесяц кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей. Але ў большасці выпадкаў гэта дрэнна атрымліваецца.

У Івацэвіцкім раёне для рэалізацыі арганізацыйных і практычных мерапрыемстваў па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях прымаюцца неабходныя ўпраўленчыя рашэнні па выкананні патрабаванняў Дэкрэта № 18 камісіяй па справах непаўналетніх райвыканкама, аддзелам адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, аддзелам унутраных спраў, сельвыканкамамі, установамі адукацыі... Кіруецца патрабаваннямі Дэкрэта № 18 міжведамасны каардынацыйны савет пад кіраўніцтвам намесніка старшыні райвыканкама.

Каардынатарам работы ўстаноў адукацыі з праблемнымі сем'ямі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, з'яўляецца Сацыяльна-педагагічны цэнтр Івацэвіцкага раёна (СПЦ). Ён вядзе персаніфікаваны ўлік даных аб дзецях, што прызнаюцца такімі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і даныя абнаўляе штомесяц. Інфармацыя аб сямейнай неўладкаванасці паступае ў аддзел адукацыі, спорту і турызму з розных ведамстваў, арганізацый, ад людзей.

І тая школа, дзе выявілася праблема, вывучае сітуацыю, праводзіць сацыяльнае расследаванне, складае акты абследавання. Па кожным факце з бацькамі адбываецца прафілактычная гутарка. Па выніках вывучэння ўмоў пражывання і выхавання дзяцей камісія вызначае, ці знаходзяцца дзеці ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Так, у 2015 годзе былі прызнаны такімі, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, 11 дзяцей з 7 сем'яў, у 2016-м — 19 дзяцей з 12 сем'яў, у 2017-м — 15 дзяцей з 8 сем'яў, сёлета ў першым паўгоддзі — 12 дзяцей з 8 сем'яў.

Мне здаецца, адбіранне дзяцей у бацькоў — гэта, з аднаго боку, правільны крок, бо малых трэба ратаваць, а з другога, калі паглядзець на іх тату ці маці, для іх адбіранне дзяцей — гэта абрыў танюсенькай і адзінай нітачкі, якая яшчэ магла б стаць стымулам для выкарасквання з багны алкаголю. Мы прывыклі глядзець на ізгояў грамадства зверху ўніз, з адценнем пагарды: як гэта для іх не самае каштоўнае дзеці? На ўзроўні мацярынскага інстынкту дзеці і для хворых на алкагалізм самае каштоўнае. Яны гатовы паабяцаць перад усім светам, што будуць старацца забраць дзяцей, вярнуць лад у сям'ю... Але скажыце, хто лічыў, колькі павінна зарабляць абавязаная асоба, каб выканаць усе патрабаванні і па кампенсаванні дзяржаўных сродкаў, на выхаванне дзіцяці і па стварэнні для дзяцей належных умоў і, самае галоўнае, зноў не паддацца на ўгаворы сяброў «замачыць» пачатак новага жыцця?

**Тамара ТУРКО, загадчыца сектара аховы дзяцінства аддзела адукацыі, спорту і турызму Івацэвіцкага райвыканкама,** не адзін год змагаецца за вяртанне да цвярозага ладу жыцця абавязаных асоб. Яны ж супакойваюць сябе і яе абяцаннямі, вераць шчыра, даюць клятвы з біццём у грудзі, але... гэтак жа лёгка аб гэтым забываюць, як толькі вяртаюцца з лячэбна-працоўнага прафілакторыя (ЛПП). «Б'ешся, б'ешся, а ўсё дарэмна. Дзеці чакаюць, што мама іх абавязкова забярэ, а тыя мамы вызваляюцца з ЛПП, забываюць пра ўсё і зноў ступаюць на тую ж сцежачку...»

Чаму? Страх перад адказнасцю, перад тым, што грашовых сродкаў пастаянна не хапае, што даўгі за камунальныя паслугі пагашаюцца павольна, што няма за што купіць дзіцяці такую ж абноўку, як купляюць яго аднакласнікам... Ды і шмат іншых жыццёвых абставін не даюць магчымасці разагнуць плечы. Трэба ўлічваць, што ў тых, чыё жыццё пакацілася ўніз, як правіла, няма надзейных памочнікаў, сяброў, а толькі сабутэльнікі, якія, як вороны, кружаць над імі. Уяўляеце, у які кут бывае загнана сям'я, калі ў ёй спецыяльна хаваюць для камісіі «дзяжурны» набор прадуктаў, каб паказаць, што ў іх жыццё наладжваецца? Колькі часу пражыве чалавек у такім напружанні, каб не сарвацца?

— З кожнай абавязанай асобай, непаўналетнія дзеці якой маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, праводзіцца індывідуальная работа: арганізацыйныя, інфармацыйныя меры, растлумачваецца заканадаўства, іх правы і абавязкі, у тым ліку абавязак кампенсаваць у поўным аб'ёме сродкі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне іх непаўналетніх дзяцей, — тлумачыць Тамара Лявонцьеўна. — Вядзецца работа па памяншэнні памеру расходаў, якія падлягаюць спагнанню, і вызваленні абавязаных асоб ад аплаты запазычанасці ў адпаведнасці з артыкулам 10 Дэкрэта № 18. Напрыклад, у 2017 годзе адной абавязанай асобе былі зменшаны расходы да 90 працэнтаў, а другой — спісана запазычанасць у суме 626,84 рубля. Сёлета яшчэ тром абавязаным асобам спісана запазычанасць у суме 7478,42 рубля. Калі ў сям'і вялікая запазычанасць па аплаце за электраэнергію і камунальныя паслугі, то вывучаецца магчымасць аказання ёй аднаразовай адраснай дапамогі. Толькі б чалавек адумаўся.

Дарэчы, на ўтрыманне дзіцяці, якое знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, штомесячныя выплаты (узрост да 6 гадоў) складаюць 234,45 рубля і 242,27 рубля — ад шасці гадоў і больш. А ўзровень пакрыцця расходаў за 2016 год склаў 53,9 працэнта, летась — 46,8, за першы квартал бягучага — 59,3 працэнта.

— Праблемы па спагнанні сродкаў узнікаюць па прычыне адсутнасці ў абавязанай асобы салідарнага адказчыка і наяўнасці двух і больш выканаўчых лістоў, — дадае Тамара Турко. — Немалаважным пры працаўладкаванні абавязаных асоб з'яўляецца стан іх здароўя, які не заўсёды дазваляе працаўладкоўваць іх на больш высокааплатныя рабочыя месцы. Да ліку праблемных пытанняў можна аднесці назначэнне судом адбывання пакарання ў следчым ізалятары (сёння там знаходзяцца два чалавекі), дзе абавязаныя асобы не маюць магчымасці працаваць, што яшчэ больш павялічвае запазычанасць па выплаце сродкаў.

Паказчык эфектыўнасці работы ў напрамку аховы дзяцінства — уладкаванне на выхаванне ў сям'ю дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і захаванне сям'і для дзіцяці. За 2016—2017 гады ўсе дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, былі ўладкаваны ў прыёмныя, апякунскія сем'і, дамы сямейнага тыпу — а значыць, не накіроўваліся ў інтэрнатныя ўстановы.

Толькі заспакойвацца не прыходзіцца, бо не скарачаецца колькасць дзяцей, у адносінах да якіх бацькі былі пазбаўлены правоў: 2015 год — гэта 4 бацькоў у адносінах да 6 дзяцей, 2016-ы — адпаведна 8 бацькоў і 8 дзяцей, 2017-ы — 12 бацькоў і 12 дзяцей. За мінулы год у аддзел адукацыі, спорту і турызму райвыканкама і СПЦ паступіла 228 паведамленняў аб сямейнай небяспецы ў дачыненні да 1380 дзяцей.

За мінулы год адпраўлена 826 табліц-справаздач, якія рассылаюцца штомесяц, аб выкананні Дэкрэта № 18, сёлета іх чакаецца не менш.

Асноўнай прычынай сацыяльнага сіроцтва па-ранейшаму застаецца алкагалізм. Магчыма, ёсць сэнс накіраваць намаганні адпаведных службаў найперш на дапамогу бацькам — лячэнне (не кадзіраванне) іх ад гэтай хваробы?

**Валянціна БОБРЫК**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

## У Беларусі працаўладкаваныя каля дзвюх тысяч нядбайных бацькоў

Як заявілі «Звяздзе» ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, працаўладкаваннем абавязаных асоб займаюцца органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне раённых і гарадскіх выканкамаў. Каб працаўладкаваць гэтую катэгорыю грамадзян, рашэннямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама вызначаны пералік арганізацый, у які на 1 ліпеня 2018 года ўключана 6966 прадпрыемстваў. Паводле даных Мінпрацы і сацабароны, па працаўладкаванні ў першым паўгоддзі 2018 года звярнуліся 1936 абавязаных асоб, 1934 з якіх былі працаўладкаваныя.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Сямейны альбом

# ТРЫ СЯСТРЫ,

## АБО ЭПОХА ПРАЗ ГІСТОРЫЮ СЯМ'І

**Шура, Марыя і Вера Сцяпанавы. Яны знайшлі свой лёс у Мінску і сябравалі ўсё жыццё. Шура — харызматычная, правільная і мэтанакіраваная. Марыя — рагатуха і майстрыха на ўсе рукі. І Вера — самая малодшая, але вельмі мудрая, чуйная і інтэлігентная.**



Шура, Марыя і Вера Сцяпанавы з бацькам.
Здымак зроблены ў 1939 годзе ў Сталінградзе (цяпер Валгаград).

Сёстры раслі ў шматдзетнай сям'і пуцілаўскага рабочага Ігната Сцяпанава. Голад у Піцеры пасля грамадзянскай вайны прымусіў сям'ю сарвацца з месца. Старэйшая сястра Шура вырашыла пашукаць долю ў Беларусі. А Ігнат Сцяпанаў з жонкай Наталляй падхапілі малодшых дзяцей і паехалі ў Сталінград (сучасны Валгаград) на будаўніцтва гідраэлектрастанцыі... У выніку на будоўлю ўдалося ўладкавацца старэйшым сынам. Ігнат жа па ўзросце здолеў знайсці толькі месца дворніка, затое ў доме сталінградскай інтэлігенцыі. Таму сяброўкі ў сясцёр Сцяпанавых былі вельмі адукаваныя, выхаваныя і пазбаўленыя класавых забабонаў. Дочкам дворніка было дазволена нават карыстацца багатымі хатнімі бібліятэкамі. Асабліва прыахвоцілася да чытання малодшая, Вера.



Зенітчыца Марыя Сцяпанава
9 мая 1945 года ў Будапешце.

Марыя і Вера на той момант абедзве хадзілі ў школу. Праўда, абутак у іх быў адзін на дваіх, таму зімой даводзілася наведваць заняткі па чарзе. Затое адзенне лічылася самым адмысловым у класе, бо іх маці да рэвалюцыі была швачкай і выдатна яго канструявала. Дарэчы, на самым раннім сумесным фотаздымку сукенкі малодшых сясцёр пашыты менавіта Наталляй Сцяпанавай. Зроблена фота ў канцы трыццатых гадоў, калі ў госці да родзічаў з Мінска прыехала старэйшая сястра Шура. Яна да таго часу зрабіла ў Беларусі партыйную кар'еру і вырашыла наведаць малодшых сястрычак. На памяць яны сфатаграфаваліся з любімым таткам. Наступны раз сёстры сабраліся разам амаль праз дзесяць гадоў, калі кожная прайшла свой цяжкі шлях праз вайну...

**Шура** да пачатку Вялікай Айчыннай была ўжо вядомым у Беларусі партыйным лідарам. У першыя дні вайны яе муж быў мабілізаваны. Сама яна перайшла на нелегальнае становішча. Аляксандра Сцяпанава была членам Мінскага падпольнага абкама партыі. Займалася арганізацыяй антыфашысцкіх ячэек у падведамасным ёй Слуцкім раёне, неаднаразова хадзіла ў разведку ў акупіраваны Мінск. Заслугі Аляксандры Ігнатаўны Сцяпанавай адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі, яе фатаграфія і асабістыя рэчы экспануюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

...Пасля вайны Шура засталася адна: муж загінуў, сынок памёр



Вера Сцяпанава
пасля вайны.

ад хваробы, пакуль маці ваявала. Выратавала работа: трэба было адбудоўваць краіну. Дзякуючы багатаму арганізацыйнаму вопыту Шура хутка рухалася па кар'ернай лесвіцы. Займала кіруючыя партыйныя і гаспадарчыя пасады. У прыватнасці, пасля вайны, калі ў Беларусі назіраўся кадравы голад, не маючы вышэйшай адукацыі, яна здолела пэўны час кіраваць адным з рэспубліканскіх міністэрстваў. Акрамя таго, Аляксандра Сцяпанава двойчы выбіралася дэпутатам у Вярхоўны Савет СССР.

Але марай Шуры было сабраць у Мінску сваю сям'ю, любімых сясцёр. Марыю знайсці было лягчэй: у 45-м яна даслала старэйшай сястры свой фотаздымак, зроблены 9 мая ў Будапешце, дзе сустрэла заканчэнне вайны.

**Марыя** таксама прайшла слаўны шлях. Усю вайну яна праваявала ў складзе зенітна-кулямётнай часці. Маладая, прыгожая, вясёлая. Прыгадваючы ваеннае ліхалецце, яна звычайна лаканічна расказвала пра стральбу па варожых самалётах, пра тое, што яе падраздзяленне часам іх збівала, а потым падрабязна і з задавальненнем апісвала, якія няпростыя ўзаемаадносіны былі ў іх з хлопцамі з суседняга падраздзялення. Адчувалася, што вайна для маладых дзяўчат з часам стала руцінай. А сапраўднае, цікавае жыццё праходзіла па-за ёй і насуперак ёй: хлопцы, флірт, каханне. Гэта дапамагала перажыць адчуванне смерці, якая побач... Але ж і сваю руцінную працу на вайне Марыя выконвала ад усёй душы — вярнулася з узнагародамі, якія ўсё жыццё з гонарам надзявала на Дні Перамогі. Мабілізаваўшыся з арміі, Марыя з задавальненнем адгукнулася на запрашэнне старэйшай сястры і прыехала ў Мінск. Неўзабаве яна ўладкавалася на Мінскі трактарны завод, які пачаў будавацца. Тут Марыя добрасумленна працавала да пенсіі. Яе партрэты ўпрыгожвалі заводскую Дошку гонару, а фотаздымкі руплівай станочніцы час ад часу друкаваліся ў СМІ. У сям'і Марыю цанілі за вясёлы нораў, за звонкі голас, што звінеў на ўсіх сямейных пасядзелках. А яшчэ яна была выдатнай краўчыхай: відаць, увабрала талент маці. А вось далікатнасць, мудрасць і інтэлігентнасць былой піцерскай швачкі, відаць, дасталіся ў спадчыну самай малодшай з сясцёр Сцяпанавых — Веры, цяжкі ваенны лёс якой не быў усыпаны ўзнагародамі.



Аляксандра Сцяпанава,
ветэран вайны.

**Вера** запісалася на курсы медыцынскіх сясцёр, як толькі пачалася вайна, і неўзабаве была адпраўлена на фронт. Вясной 1942 года ў выніку няўдалай аперацыі савецкіх войскаў на тэрыторыі Украіны ў акружэнні апынуліся тры арміі, у палон трапіла больш за 200 тысяч чырвонаармейцаў. У тым ліку і Вера. Перасыльны лагер для ваеннапалонных фактычна ўяўляў сабой поле, абнесенае калючым дротам. Пры першай магчымасці дзяўчына адтуль уцякла і ўпотайкі прабралася да родзічаў, якія прыжыліся ў ціхім украінскім мястэчку. Пасля вызвалення Украіны Вера ўладкавалася на адну з шахтаў Данбаса, дзе пачаліся актыўныя аднаўленчыя работы. Тут неўзабаве яе знайшоў ліст з Мінска ад старэйшай сястры Шуры. Зборы былі нядоўгімі, і вось сёстры зноў разам. Яны больш не расстануцца ніколі. Уладная Шура, гаспадарчая Марыя і душэўная Вера.

Вера ніколі не лічылася ветэранам вайны. Дакументы часці, у складзе якой яна ваявала, прапалі ў ліхаманцы акружэння. Доказам яе ўдзелу ў баявых дзеяннях мог стаць хоць бы адзін з «трыкутнікаў», якія яна адпраўляла з фронту бацьку ў Сталінград. Але яе лісты не захаваліся. Як быццам і не была Вера на той вайне... І мірнае жыццё наладзілася не адразу. Былая ваеннапалонная, знаходзілася на акупіраванай тэрыторыі? Многім работадаўцам гэта не падабалася. Але начытанасць, гатоўнасць набываць веды і нейкая прыроджаная інтэлігентнасць дапамаглі Веры працаўладкавацца ў адну з мінскіх бібліятэк. Яна так усё жыццё і працавала сярод любімых ёю кніг. На пенсію пайшла з бібліятэкі Беларускага тэхналагічнага інстытута. У свой час за бібліятэчным сталом яе заўважыў і будучы муж. Абаянне і адукаванасць дачкі сталінградскага дворніка пакарылі былога франтавога карэспандэнта і пачынаючага кіраўніка СМІ. Неўзабаве яны пажаніліся. Сям'я стала культам для Веры. Яна, здаецца, пераняла дзелавітасць старэйшай сястры Шуры, плануючы жыццё свайго сямейства, практычнасць сястры Марыі ў вядзенні хатняй гаспадаркі. Сама ж прыўнесла ў сямейную атмасферу ўласцівыя ёй душэўнасць і даверлівасць.

Вера і адыходзіла апошняй са Сцяпанавых, пахаваўшы і аплакаўшы ўсіх.

Перад смерцю яна прывяла ў парадак сямейныя альбомы фатаграфій, дакументы, што захаваліся, начарціла радаслоўнае дрэва Сцяпанавых. Для дзяцей, для ўнукаў. Каб помнілі...

**...У наш час альбомы з фотаздымкамі становяцца анахранізмам. Ці ўсё ж каштоўным рарытэтам? А ці шмат мы ведаем пра людзей з фотаздымкаў, што застаюцца нам ад бацькоў? А што будуць ведаць нашы дзеці? А між іншым, за кожным такім альбомам — цэлая эпоха ў жыцці краіны, гісторыя цэлага роду, на якой можна выхоўваць не адно пакаленне.**

Кацярына АГЕЕВА

■

## НАША ІАЛАНТА ПАКАРЫЛА ЯПОНІЮ

У чэрвені на адкрыцці Фестывалю расійскай культуры ў Японіі ў вялізным канцэртным зале «Санторы-хол» у Токіа надзвычай пранізліва прагучала, бадай, самая светлая опера П. І. Чайкоўскага — «Іаланта» ў выкананні Расійскага нацыянальнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Плятнёва. На галоўную партыю Іаланты маэстра запрасіў вядучую салістку Вялікага тэатра Беларусі Анастасію Масквіну.



Беларуская прыма стала госцяй вераснёўскага нумара часопіса «Алеся». У сваім інтэрв'ю часопісу Анастасія падзялілася не толькі ўражаннямі аб японскай публіцы, але і творчымі планамі на найбліжэйшы тэатральны сезон, з удзячнасцю прыгадала сваіх настаўнікаў, расказала пра тых, каго лічыць сваім найлепшым сябрам.

## ЧАПАЕЎ І ПЕЦЬКА СУСТРЭЛІСЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ФІЛЬМЕ




Беларусь стала месцам, дзе адкрыўся талент многіх артыстаў, якія потым праславіліся на ўвесь Савецкі Саюз. Так, у 1931 годзе славуты беларускі рэжысёр Уладзімір Корш-Саблін здымаў першы гукавы фільм на беларускай мове «Першы ўзвод». Менавіта ў гэтай карціне склаўся зорны дуэт мегапапулярнага фільма «Чапаеў», а менавіта Барыса Бабачкіна (Чапаеў) і Леаніда Кміта (Пецька). Пра гэту і іншыя цікавыя старонкі гісторыі айчыннага кінематографа расказвае рэпартаж з музея беларускага кіно, надрукаваны ў вераснёўскім нумары часопіса «Алеся». З яго можна даведацца пра самыя незвычайныя экспанаты музея, а таксама азнаёміцца з афішай найбліжэйшых кінапраглядаў, бо ў музеі фільмы яшчэ і дэманструюць.

## АДПАЧЫВАЦЬ ТРЭБА СМАЧНА



Так лічыць гаспадыня аграсядзібы «Валерыя» Наталля Пракапук, якая некалькі гадоў таму выкупіла непадалёк ад Белавежскай пушчы будынак старой вясковай школы, стварыла аграсядзібу і назвала яе ў гонар любімай бабулі. Сёння гэтая сядзіба славіцца як «гастранамічная», бо аўтэнтычныя беларускія рэцэпты Наталля асабіста збірала па ўсёй Беларусі. Летась «Валерыя» перамагла ў конкурсе на самую лепшую аграсядзібу ў намінацыі «Нацыянальная беларуская кухня». Пра свае кулінарныя экспедыцыі ў «глыбінку», планы развіцця сядзібы і перспектывы сямейнага бізнесу наогул Наталля Пракапук расказвае ў вераснёўскім нумары часопіса «Алеся».

# «З ДЭКРЭТУ ВЫЙШЛА Ў СВАЮ СПРАВУ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Насамрэч Вольга, якая ў сваім жыцці працавала і піяршчыкам, і журналістам, і выкладчыкам усходніх танцаў, мае яшчэ «прыкладную» адукацыю швачкі-закройшчыцы. І гэта, бадай, было першым крокам да каворкінга. Другім стала нараджэнне дзіцяці — як часта бывае, у час дэкрэтнага водпуску дайшлі рукі да колішняга захаплення, але як след працаваць, маючы гарэзлівае малое, якому цікавыя і каляровыя абрэзкі, і нажніцы з іголкамі, не атрымлівалася.

## ЯК?

— Справа ў тым, што шыццё, нават калі не было прафесіяй, увесь час заставалася маім хобі і выручала шмат разоў: калі ты пачатковец, вучышся ў інстытуце, паралельна працуеш на палову стаўкі, а трэба за месяц пабываць на пяці «тусовачных» мерапрыемствах і яшчэ на вяселлі ў трох сябровак (гэта цалкам рэальная гісторыя, якая была ў маім жыцці), — зразумела, што грошай на новыя ўборы не хопіць. І вось тады радуешся, што можаш пашыць сабе новую сукенку і другой такой дакладна ні ў кога не будзе. Я так і рабіла, а сяброўкі былі перакананыя, што ў мяне касмічны заробак, — смяецца стваральніца «Катушкі». — Але пазней, калі засвойвала ролю маці і жонкі, шчыра скажу, не хапала самарэалізацыі. Як быццам «дзень сурка», які распісаны па хвілінах, але ж мы, жанчыны, істоты крыху звар'яцелыя, нам трэба загрузіцца напоўніцу, і вось мне для поўнага шчасця не хапала шыцця. А паколькі шыць з дзіцем было немагчыма, пачала шукаць, дзе можна рабіць гэта, так скажам, на гасцявой тэрыторыі. Аказалася, што ідэя не новая, сумесныя працоўныя прасторы — каворкінгі — рэалізаваныя ў Маскве і Кіеве, а ў нас нічога падобнага на той час не было. І я загарэлася: атрымаецца, не атрымаецца? Дзякуючы краўдфандынгавай пляцоўцы і дапамозе многіх людзей, якія падтрымалі задуму рублём, удалося адкрыць майстэрню. Хаця праз год працы шчыра магу сказаць: тады я не ведала і паловы падводных камянёў і, канешне, паналамала дроў...

**— Падзелішся каштоўным вопытам, у чым былі асноўныя памылкі?**

— Як і большасці пачаткоўцаў, мне хацелася бачыць свой праект ідэальным са старту. Таму знайшла памяшканне ў 50 квадратных метраў у прэстыжным бізнес-цэнтры — гэта было не дарагое па сталічных мерках памяшканне, але дарагое для майго праекта, і практычна за першыя тры месяцы ўвесь бюджэт, які мы сабралі на краўдфандынгу і вылучылі з сямейных запасаў, растаў бясследна. Паўстаў выбар: зачыняцца альбо працягнуць справу? На сямейнай нарадзе з мужам вырашылі працягваць і шукаць дадатковыя шляхі для таго, каб выдаткі акупляліся: адкрыць курсы шыцця, нарошчваць дадатковыя паслугі і г. д. Цяпер праект жыве на нулявой самаакупнасці: у нас няма даўгоў, усе камунальныя плацяжы сплачаны, і хоць размова пра вялікі прыбытак пакуль што не ідзе, але мы бачым рэальныя перспектывы. Таму з дэкрэту я выйшла менавіта сюды, у майстэрню «На ўсю катушку», а не на звыклую офісную працу.

**«Мы не марнуем грошы на непатрэбнае і разважаем не над тым, як жыць шыкоўна, а над тым, як жыць камфортна».**

**— І гэта пры тым, што швейныя курсы — справа хісткая: сёння ёсць людзі, заўтра няма. Як муж адважыўся на такую рызыку?**

— Ён з самага пачатку разам са мной верыў, што праект — грамадска значны, цікавы, таму трэба пастарацца яго рэалізаваць. Нават бізнесам не назавеш, гэта практычна наша агульнае другое дзіця, якое хочацца дарасціць да заўважных вынікаў. Да таго ж мы задоўга да пачатку работы селі і рэальна прыкінулі, наколькі крытычна для нашай сям'і ахвяраваць на працяглы час пэўнай грашовай сумай. І вырашылі, што ў суадносінах «праект — сямейная заначка» праект усё ж важнейшы. Калі спрабаваць, як не цяпер, калі ёсць і пэўны жыццёвы вопыт, і прафесійныя напрацоўкі, і фінансавая «падушка бяспекі»? Мы не марнуем грошы на непатрэбнае і разважаем не над тым, як жыць шыкоўна, а над тым, як жыць камфортна.

## НАВОШТА?

Гледзячы на багацце асартыменту адзення на кірмашах і ў крамах, задаешся пытаннем: навошта, з якіх меркаванняў дарослыя людзі пачынаюць вучыцца шыць, калі многім прасцей набыць рэч на сезон, а потым выкінуць ці аддаць?

Вучаніца курса Марына, педагог па прафесіі і мама траіх дзяцей, паўжартам, паўсур'ёзна сцвярджае, што толькі на курсах шыцця можа пасядзець пару гадзін спакойна і пазаймацца любімай справай, не адрываючыся штохвілінна на «чаму», «а дзе» і «мама, дапамажы». «Хоць асабіста для мяне майстар-клас дапамагае вырашыць яшчэ некалькі задач. Па-першае, сэканоміць: дзве пары дзіцячых спартыўных штаноў, якія я пашыла з абранай, якаснай тканіны, каштавалі мне як адна пара з масмаркета і з тканіны горшай якасці. Па-другое, мне вельмі падабаецца стыль «фэмілі лук», калі ўся сям'я адзетая ў аднолькавыя ці падобныя рэчы, але адшукаць іх, ужо гатовыя, для дзяцей і дарослых або складана, або зноў жа дорага. А вось пашыць — калі ласка! Ну і, нарэшце, праз некалькі заняткаў стала заўважаць, як запрацавала мая ўласная фантазія: дашываючы адну рэч, ужо думаю, як магу зрабіць другую, прыкідваю, як добра было б пашыць аднолькавую форму маім калегам-педагогам...»

Яшчэ адна вучаніца прызнаецца, што да гэтага шыць не ўмела і была перакананая, што рукі растуць «не адтуль», таму курсы — гэта быў выклік самой сабе. «Але пад такім пільным і чулым наглядам, на прафесійным абсталяванні, з падказкамі майстра нават у мяне не атрымалася сапсаваць тканіну, затое нечакана атрымалася напоўніць гардэроб некалькімі моднымі штучкамі».

Беата вучыцца шыць, каб ствараць рэчы цалкам на ўласны густ, а не марнаваць час на пошук спадніцы-мары ў крамах. Насця на выбраных рэчах — світшот, сукенка — засвойвае хітрыя тэхнікі, якія толькі звонку падаюцца складанымі. У кожнай з вучаніц свае «чаму», але аднолькавае задавальненне вынікам.

## ХТО?

Як і большасць беларусаў, Вольга ходзіць па крамах і купляе гатовае адзенне для сябе, сына і мужа, бо індывідуальны пашыў — далёка не заўсёды справа выгадная, часта зусім наадварот. «Умоўна кажучы, калі вы топ-менеджар на прадпрыемстве і зарабляеце ў дзень 100 долараў, то наўрад ці вы патраціце гэты дзень на тое, каб пашыць спадніцу, якую можна набыць у краме за 20 долараў, гэта нерэнтабельна. Але часта людзі шыюць не з фінансавых меркаванняў — ім проста цікава гэта рабіць. Да нас ідуць прадстаўнікі самых розных прафесій і ўзростаў — хоць, канешне, пераважна гэта жанчыны».

Зрэшты, ёсць адмысловы майстар-клас з сюрпрызам для мужчын — падчас яго ніводная іголка не пацярпела, удзельнікі застаюцца задаволенымі. А бывае, у «Катушку» прыходзяць і цэлымі сем'ямі: тут прыдумалі сямейны майстар-клас для мам і дзяцей. «Спачатку



мы праводзілі іх бессістэмна: раз на месяц-два кідалі кліч і чакалі, пакуль набяруцца ахвотныя. Напрыклад, рабілі падушкі-совачкі, павязкі на галаву, навагоднія мяккія цацкі і нават дзіцячыя сарафаны. Далей будзем глядзець, што патрэбна самім удзельнікам: можа, камусьці падабаюцца не совачкі, а коцікі ці свінкі, таму ў гэтым сезоне мы імкнёмся не паўтарацца, а ўвесь час прапаноўваць штосьці новае. Неўзабаве плануем адкрыць на пастаяннай аснове сямейны клуб «Модная сава» і раз на тыдзень збіраць яго ўдзельнікаў, каб пашыць разам штосьці нескладанае і цікавае. На мой погляд, гэта будзе пэўная альтэрнатыва ўрокам працы — тое, што страціла за мінулыя гады школа, якая часта адбівала абавязковымі ўрокамі па пашыве фартухоў усё жаданне браць у рукі іголку ды нітку».

Наогул сюды можа прыйсці кожны ахвотны на базавы курс. Раз на месяц праходзяць бясплатныя групавыя заняткі, падчас якіх майстры вучаць здымаць меркі, разлічваць расход тканіны, рабіць некалькі дзясяткаў відаў швоў на машынках і аверлоку, вучаць правільна падшываць уручную ніз адзення і прышываць гузікі, шыюць невялікі пробны выраб. Гэтага, у прынцыпе, дастаткова, каб зразумець, ці будзе вам цікава займацца шыццём далей.

Але зазіраюць і тыя, хто добра ўмее шыць, але дома не стае неабходнага абсталявання: для прафесіяналаў існуе паслуга «атэлье самаабслугоўвання».

## ШТО ДАЛЕЙ?

У ліпені швейны каворкінг «На ўсю катушку» ўзяў удзел у міжнародным праекце «Акадэмія актывізацыі прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці», які зладзілі Мясцовы фонд устойлівага развіцця «Інавацыі для рэгіёнаў» (Калодзішчы) і польскі Падляшскі фонд рэгіянальнага развіцця (Беласток). Навучанне на экспрэс-курсах прайшлі 24 жанчыны з розных раёнаў Міншчыны: на працягу месяца яны пашылі пяць розных вырабаў, засвоілі некаторыя швейныя хітрыкі, многія запісаліся на курсы далей і адзначылі, што хацелі б зрабіць шыццё рамяством. «Гэта значыць, у праекта ёсць перспектыва міні-бізнес-інкубатара, нашы курсы могуць стаць выдатнай базай для самазанятасці, — разважае Вольга Кастузік. — Цяпер у нашай краіне вельмі добрыя ўмовы для развіцця рамесніцтва, значна спрасціліся ўмовы рэгістрацыі дзейнасці па пашыве адзення — гэта значыць, што практычна адразу пасля курсаў можна пачынаць падпрацоўваць, а потым ствараць новыя майстэрні проста ў сваім рэгіёне — гэта ў Мінску атэлье і майстэрні на кожным кроку, а ў рэгіёнах справа пакуль не настолькі распаўсюджаная».

— Да чаго хацела б падступіцца далей — гэта стварыць анлайн-відэакурсы шыцця для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — дадае Вольга. — На жаль, цяперашняе памяшканне зусім не прыстасавана для таго, каб у ім праходзілі такія заняткі, а цікавасць з боку патэнцыйных вучняў, дакладна ведаю, ёсць. Тым больш сёння ёсць швейныя машынкі з ручным кіраваннем, яны зручныя і для калясачнікаў: можна шыць рукамі проста націскаючы кнопку. Але ўсё ўпіраецца зноўку ў грошы: сваімі сіламі здымаць серыю відэаўрокаў прыйдзецца даволі доўга, да таго ж трэба, каб вучні мелі менавіта такое, сучаснае абсталяванне. Магчыма, знойдзем інвестараў, хоць бы тых жа вытворцаў швейных машынак, якія далучацца да такога сацыяльнага праекта, і ўдасца стварыць дамашнія майстэрні альбо выязныя ўрокі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара і з асабістага архіва гераіні.**



**«Выбіраць паміж бізнесам і сям'ёй? Гэта даводзіцца рабіць штодня. Але родныя, безумоўна, на першым месцы. Мінулай зімой сын вельмі многа хварэў, таму многія планы засталіся нерэалізаванымі. Мне яшчэ вельмі пашанцавала, што з дзіцем дапамагаюць бабулі, — вялізны ім за гэта дзякуй! За любой мамай у бізнесе стаяць бабулі».**

# СУНІЧНАЕ ЖЫЦЦЁ КАЛЯНКОВІЧАЎ



## ФАЛЬКЛОРНЫЯ ГЕНЫ

Іх дом стаіць на ўскрайку вёскі Вулька-1, насупраць школы, у якой яны працуюць ужо амаль трыццаць гадоў. У госці да музыкантаў я завітала акурат напярэдадні 1 верасня.

— Страшна азірнуцца назад і задумацца пра тое, колькі дзяцей мы ўжо «выпусцілі». Здаецца, толькі ўчора прыехалі сюды. «Зялёныя» зусім, Вовава скрыпка і мой баян — вось і ўсё агульнае багацце, — успамінае Людміла.

— У гэта складана паверыць, але да таго, як мы сустрэліся, нашыя лёсы нібыта ішлі паралельна. Нарадзіліся ў беларуска-ўкраінскіх сем'ях: мая маці з Вінніцкай вобласці, яе — з Ровенскай, абодва нашыя ба́цькі з Брэсцкай. Мы скончылі музвучылішчы. Толькі я ў Брэсце, яна ў Баранавічах, — кажа Уладзімір.

Сустрэча, наканаваная лёсам, адбылася ў Мікашэвічах, куды маладую баяністку адправілі па размеркаванні, а ўчарашні салдат прыйшоў вучыць дзяцей гамам на скрыпцы. Да паразумення прыйшлі хутка: размаўлялі адной мовай — музычнай. Пажаніліся, але ў горадзе надоўга не затрымаліся.

— Гэта сучасную моладзь у вёску можна хіба адпрацоўкай па размеркаванні зацягнуць. Мы ў свой час ехалі з ахвотай. У Вульцы прапанавалі працу, жыллё ў інтэрнаце. А што яшчэ трэба маладым ідэйным музыкантам?

Уладзімір упэўнены, што за музычныя здольнасці ім з Людмілай трэба дзякаваць продкам:

— З дзяцінства памятаю, як усе пакаленні сям'і збіраліся за вялікім сталом і зацягвалі «Як служыў я ў пана». Тую самую песню, дзе пра «куру-шчабятуру, гусю-мусю-сюсю, качу, якая дробна скача». Вядомыя і аднолькава любімыя радкі як для ўкраінцаў, так і для беларусаў. Мой прадзед Рыгор быў кавалём, у вёсцы яго паважалі не толькі за цвёрдую руку, але і за тое, што ніводныя вячоркі не прапускаў — добры быў скрыпач. Да таго ж адзін мой дзядзька граў на мандаліне, другі на гітары. Таму ніхто не сумняваўся, што і я буду здольны да музыкі. Гены ўсё вырашылі.

У Людмілы свая гісторыя. Яе маці — знатная частушачніца. Калі на вёсцы ладзілі спаборніцтвы, хто больш прыпевак ведае, дык яна — заўсёды першая.

— Збяруцца матуліны сяброўкі ў нашай хаце і просяць: «Люда, бяры баян ды падыграй, а мы паспяваемо». Так на слых і навучылася мелодыі падбіраць, — прыгадвае жанчына. — У мяне часта запытваюцца, адкуль у маёй галаве столькі песень. Вядома, гэта матуліна спадчына.

Сыны Калянковічаў — Вадзім і Юра, як і бацькі, акунуліся ў фальклор з маленства. Калі трэба, і песню заспяваюць, і крыжачка затанчаць, і байку на мясцовым дыялекце раскажуць так, што ўсе заслухаюцца. Што цікава, дзе б яны ні апынуліся, заўсёды з гонарам падкрэсліваюць: мы з Вулькі-1, ёсць такая вёска на Палессі. Але прафесіі хлопцы абралі не звязаныя з творчасцю (старэйшы Вадзім працуе ў Кітаі, а малодшы Юра — дантыст у Мінску). Музычныя здольнасці цяпер дэманструюць толькі ў бацькоўскай хаце. Любяць зацягнуць што-небудзь народнае на два галасы.

## З «ВАЛАЧОБНІКАЎ» У «СУНІЧКІ»

Фальклорны ансамбль у Вулькаўскай школе Калянковічы заснавалі адразу, як туды прыйшлі. Ніякіх амбіцыйных мэт перад сабой не ставілі. Што ведалі самі, таму і дзяцей сталі вучыць. Але перш за ўсе рабілі ўпор на традыцыі вёскі, у якой жылі.

— У 90-я гады мы былі частымі гасцямі Ніны і Васіля Шпакоўскіх — галоўных захавальнікаў вулькаўскага (ці, як тут кажуць, волянскага) фальклору. Хацелася пераняць у іх як мага больш мясцовых песень, каб перадаць будучым пакаленням. Мы цяпер і сябе лічым тутэйшымі, ведаем пра Вульку і яе жыхароў літаральна ўсё.

Цікава, што ніякіх папяровых ці лічбавых архіваў у Калянковічаў няма. Усе тэксты і мелодыі яны ведаюць на памяць: «Фальклор у чыстым выглядзе — вусная народная творчасць».

Першапачаткова іх ансамбль называўся «Валачобнікі». «Сунічкай» стаў з лёгкай рукі фотакарэспандэнта раённай газеты Рыгора Жука.

— Ён доўга разглядаў шкаляроў у кашулях са стракатай вышыўкай, калі рабіў пра нас матэрыял, а пасля сказаў: «Якія «Валачобнікі»? Гэта ж нашыя лунінецкія «Сунічкі». Мы пярэчыць не сталі. Назва ідэальна лягла на калектыў і падкрэсліла асаблівасць Лунінецкай зямлі, дзе ў кожным агародзе — сунічныя плантацыі, — кажуць Калянковічы.

Пачынаўся ансамбль з песень і танцаў. Але ў нейкі момант Уладзіміру падалося, што скрыпкі з баянам для калектыву малавата, і ён вырашыў дадаць музыцы жывога вясковага гучання. Бубен, трашчоткі, званочкі, рубель, дровы, калатушка, драўляныя лыжкі і нават каса — якіх толькі шумавых інструментаў не ўбачыш у гэтым ансамблі! Штосьці куплялі, але многае музыкант зрабіў сам. Гэта штучныя рэчы, у звычайных музычных магазінах не знойдзеш.

— Граць на іх нескладана, нават самыя маленькія ўдзельнікі «Сунічкі» з лёгкасцю становяцца віртуозамі. А ведаеце, як выглядаюць беларускія маракасы? Не здзіўляйцеся, і ў нас яны былі. Гэта невялікія скрынкі з сухім гарохам.

Уладзіміра можна смела назваць майстрам на ўсе рукі. Зараз ён працуе ўжо над другой колавай лірай. Інструмент старадаўні (на Беларусі з'явіўся яшчэ ў XVI ст.), незвычайны і даволі дарагі: «Вядома, вясковая школа такую пакупку дазволіць сабе не можа, дык чаму б не зрабіць самому?»

Калянковічы прызнаюцца, што нават праз трыццаць гадоў вывучэння фальклору яны ўсё адно зачараваныя ім.

— Можа, таму што жывём на Палессі, а яно ўвабрала ў сябе беларускую, украінскую, польскую і казацкую культуру? Тут фальклор асаблівы. Ёсць, напрыклад, песня, у якой аж чатыры назвы — «Лысы», «Надзя», «Карапет» і «Зялёны гай». У кожнай мясцовасці па-свойму спяваюць, танчаць пад яе па-рознаму, але мелодыя — адна.

— Бывае, прыйду да мамы пахваліцца: «Глядзі, якую я прыгожую беларускую песню для дзяцей знайшоў». Яна паслухае першы куплет і кажа: «Дык гэта ж украінская!» — расказвае Уладзімір.

Пасля гэтых слоў прашу маіх суразмоўнікаў заспяваць што-небудзь, яны не губляюцца:

— Ой, гудзе-гудзе музыка,
аж пазёмка сцелецца.
Ой, грайце музыканты,
хай мяце мяцеліца!

## НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА — ГЭТА НЕ ТРЭНД

Гонар Уладзіміра і Людмілы — калекцыя вышываных кашуль. Збіраць яе пачалі яшчэ да таго, як з'явіўся ансамбль.

— Самы першы экзэмпляр дастаўся ад дзядулі. Шыкоўны блакітны ўзор на саматканым палатне сабраны з найдрабнейшых крыжыкаў, — дэманструе любімую вышыванку Уладзімір. — Яшчэ адну мне зрабіла маці, дзве заказваў у вулькаўскіх майстрых.



Калянковічы прызнаюцца, што мода на вышыванкі, якая сёння пануе ў сталіцы, ім не вельмі падабаецца. Бо каштоўнасць элементаў традыцыйнага строю губляецца, калі нехта кажа: «Сёння гэта ў трэндзе».

— Народная культура не ўпісваецца ў вузкае паняцце моды. У «Сунічцы» нават самыя маленькія ведаюць, што ўзор на кашулі мае сакральны сэнс. Славяне верылі, што вышыўка засцерагае чалавека ад хвароб і ўсялякіх бед, — тлумачаць музыканты.

Таму да канцэртных касцюмаў Уладзімір і Людміла ставяцца з асаблівым пачуццём. Усе строі ансамбля ручной работы, іх робяць матулі і бабулі артыстаў. А кожнай кашулі тут даюць імя яе першага ўладальніка, бо ўсе касцюмы перадаюцца ад аднаго «сунічнага» пакалення іншаму. Перад кожным канцэртам «Сунічкі» адбываецца цэлы рытуал «беларускасці»: трэба бачыць, як маленькія хлопчыкі вучацца зацягваць тканыя паясы, а дзяўчаткі адна адной заплятаюць чырвоныя стужкі ў косы.

Дзеці прыходзяць у ансамбль, калі вучацца ў другім класе. Хтосьці скажа, што рана, але чым хутчэй пачнеш далучаць да народнай культуры, тым лепш.

Дзіву даешся, калі глядзіш на выхаванцаў Калянковічаў. Ім не трэба тлумачыць, наколькі важна ведаць свае карані і захоўваць народную культуру. У чым сакрэт?

— Можна штодзень казаць дзецям пра фальклор, але яны нічога не зразумеюць. А можна паказаць сваім прыкладам, што гэта крута. Мы ж заўсёды на сцэну выходзім разам. Абсалютна шчыра граем і спяваем. Дзеці гэта адчуваюць.

На развітанне запытваюся ў музыкантаў, ці не надакучваюць яны адно аднаму — разам і дома, і ў школе, і на канцэртах?

— У нас не толькі сямейны, але і творчы саюз. Шмат ідэй для «Сунічкі» ўзнікае менавіта пасля працы. На занятках — дзеці, і яны патрабуюць увагі. Там вучыш іх, а не творчасцю займаешся. Дома можна падумаць над новымі нумарамі. Наш тыповы вечар — сядзім спяваем, падбіраем мелодыі. На сваркі проста не хапае часу, — разважае Людміла.

Вячорак на вёсцы сёння няма. Але музыкантаў па-ранейшаму чакаюць на любых святах, у першую чаргу на вяселлях. У гэтым, магчыма, і яшчэ адзін складнік «сунічнага» шчасця Калянковічаў: калі перад вачыма пастаянна закаханыя пары, то і сам такім будзеш.

**Ганна КУРАК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



# ШЛЮБ НА ДОЎГУЮ ПАМЯЦЬ,

## або Як маладыя здзівілі сваіх гасцей

**Моладзь сёння крэатыўная, скажуць многія. А на радасць нашу трэба дадаць, яна яшчэ і добрая.**

Незвычайная рэгістрацыя шлюбу адбылася ў Целяханах, што ў Івацэвіцкім раёне, 28 ліпеня. Маладыя папярэдзілі сваіх гасцей, каб кветак ім не дарылі, а замест гэтага віншавалі дзіцячымі цацкамі.

Хтосьці з гасцей здзівіўся, хтосьці падумаў, што маладыя рыхтуюцца стаць бацькамі... Але Аляксандр Папека і Дзіяна Пушыла ўсіх супакоілі: сюрпрыз дабрачынны. Гасцей на ўрачыстую рэгістрацыю шлюбу прыйшло многа, чалавек 50, і, віншуючы маладых, яны дарылі ім мячы, машынкі, лялек, наборы для пясочніцы, лега...

Гэтую гару цацак пасля вяселля ўручылі Пінскаму дому дзіцяці, чым расчулілі ўвесь персанал і парадавалі дзяцей.

Няхай гэты шчымлівы выпадак стане прыкладам для іншых маладых. А бацькам, якія выгадавалі такіх дзяцей, — нізкі паклон. Сям'я, якая пачынаецца з дабрыні і міласэрнасці, мае вялікі шанц пранесці каханне праз усё жыццё.

**Валянціна БОБРЫК,** *г. Івацэвічы.*

**Фота з архіва сям'і Папекаў.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец), в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С. В., извещает о проведении 16 октября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**Условие продажи:** **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение лотов №№ 1–124:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **В составе: капитальное строение с инв. № 300/С-2574**, общей площадью **2 018,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха по переработке рыбы. Капитальное строение с инв. № 350/С-51854** общей площадью **897,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание санитарной обработки тары. Капитальное строение с инв. № 350/С-51855** общей площадью **201,1 кв. м,** назначение – здание административное, наименование – **одноэтажное кирпичное административное здание. Капитальное строение с инв. № 350/С-75486** общей площадью **2 721,1 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание холодильника. Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственных зданий по ул. Шилова, 16. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002000638** общей площадью **2,0237 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Здание административно-хозяйственное, холодная пристройка (инв. № 0003). Капитальное строение (инв. № 0004, № 0055, № 0054) общей площадью **167,3 кв. м,** наименование – **здание бойлерной.** Капитальное строение (инв. № 0007) общей площадью **111,0 кв. м,** наименование – **здание павильона ПК-24 (бытовки грузчиков)**. Капитальное строение (инв. № 0008) общей площадью **949,9 кв. м**, наименование – **одноэтажное металлическое здание склад «Японское море»**. Капитальное строение (инв. № 0006) общей площадью **30,0 кв. м,** наименование – **погреб-склад ГСМ.** Капитальное строение (инв. № 0005) общей площадью **12,8 кв. м**, наименование – **здание проходной**. Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0035). Склад (инв. № 0024). Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Склад (инв. № 0027). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029). ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). ТП (инв. № 0026). Гараж (инв. № 0036).Эстакада (инв. № 0037). Ворота, ограждение (инв. № 1001, 1000). Ограждение (забор кирпичный, инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008). Линия очистных сооружений (инв. № 1005). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3449). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3448). Кондиционер Hyundai HSH-S241 NBE (инв. № 3450). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3212). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3213). Теплообменник BLE 352 A70 E-S CF (инв. № 3215). Кондиционер Ballu BSR-0,9 H (инв. № 3330). Воздухоохладитель ВН 354Е 85 (инв. № 3460). Воздухоохладитель ВН 354Е 85 (инв. № 3461). Воздухоохладитель ВН 404Е 85 (инв. № 3462). Воздухоохладитель ВН 404Е 85 (инв. № 3463). Автомат ЭМ16 (инв. № 3237). Агрегат КМ-80-65-160 (инв. № 3336). Агрегат компрессорный MC-H8-ZB21KE-TFD (инв. № 3197). Агрегат компрессорный MC-H8-ZB21KE-TFD (инв. № 3214). Агрегат компрессорный VC-H8-ZB38KE-TFD (инв. № 3198). Агрегат компрес-конденсат AK-4PCS10-Y-H-B2D1F1K1M1 (инв. № 3456). Агрегат компрес-конденсат AK-6H25-Y-H-AIB3D1F1M1 (инв. № 3457). Вентилятор ВЦ 4/75 №5 (инв. № 3242). Вентилятор ВЦ 4/75 № 2 (инв. № 3243). Водонагреватель ЭВПЗ-15 (инв. № 3199). Водонагреватель ЭВПЗ-15 (инв. № 3200). Входной козырек (инв. № 3272). Распределительный пункт РП-04 (инв. № 3006). Регулятор расхода ПВС АРТ-01.01 (инв. № 3208). Сигнализация (административное здание) (инв. № 3305). Сигнализация (магазин) (инв. № 3326). Сигнализация (склад) (инв. № 3303). Трансформатор силовой ТМ-400 (инв. № 3009). Трансформатор силовой ТМ-400 (инв. № 3217). Шкаф управления ЕВ2-18Е1.3 (инв. № 3458). Шкаф управления ЕВ2-25Е1.3 (инв. № 3459). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3211). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3223). Шкаф управления ЕС-Т9 (инв. № 3224). Шкаф учета (инв. № 3323). Шкаф ШР 8гр (инв. № 3244). ЩИТ ЩО-70 (инв. № 3015). Щит ЩО-59 (инв. № 3013). Дорожный знак (610*1730) на одной метал. стойке (инв. № 3452). Теплосети (инв. № 2002) | **2 669 501,00** | 133 475,05 | 266 950,10 |
| 2 | Весы ВП-15Ф.2 эл. печатающие фасовочные (инв. № 3257) | **90,00** | 4,50 | 9,00 |
| 3 | Весы ТВ-М-600,2-А1(Н) товарные с автономным питанием (инв. № 3271) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 4 | Витрина холодильная «Ариэль» ВНЗ-130 (инв. № 3319) | **300,00** | 15,00 | 30,00 |
| 5 | Витрина холодильная «Вита» 0,1Э-1,1 (инв. № 3344) | **830,00** | 41,50 | 83,00 |
| 6 | Витрина холодильная «Белинда» ВУ 2-180 (инв. № 3324) | **1 100,00** | 55,00 | 110,00 |
| 7 | Витрина холодильная «Белинда» ВН 2-180М2 (инв. № 3325) | **620,00** | 31,00 | 62,00 |
| 8 | Витрина холодильная «Белинда» ВУ 2-200 (инв. № 3322) | **1 000,00** | 50,00 | 100,00 |
| 9 | Витрина холодильная ВН 3-180 «Ариэль» (инв. № 3299) | **620,00** | 31,00 | 62,00 |
| 10 | Витрина холодильная ВС 3-180 «Ариэль» (инв. № 3300) | **570,00** | 28,50 | 57,00 |
| 11 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3312) | **370,00** | 18,50 | 37,00 |
| 12 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3317) | **120,00** | 6,00 | 12,00 |
| 13 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3311) | **240,00** | 12,00 | 24,00 |
| 14 | Ларь морозильный ELCOLD CX 35 (3 корзины, замок) (инв. № 3314) | **510,00** | 25,50 | 51,00 |
| 15 | Морозильный ларь для мороженого IC300 SC (2 корзины) (инв. № 3298) | **650,00** | 32,50 | 65,00 |
| 16 | Морозильный ларь для мороженого IC300 SC (3 корзины) (инв. № 3297) | **650,00** | 32,50 | 65,00 |
| 17 | Печь муфельная учебная ПМ-10-01 (инв. № 3216) | **930,00** | 46,50 | 93,00 |
| 18 | Счетчик денег «Magner 35DS» (инв. № 3065) | **770,00** | 38,50 | 77,00 |
| 19 | Термостат ТС-80М2 (инв. № 3182) | **410,00** | 20,50 | 41,00 |
| 20 | Термостат ТС-80М2 (инв. № 3183) | **410,00** | 20,50 | 41,00 |
| 21 | Упаковщик TW-450 (инв. № 3342) | **100,00** | 5,00 | 10,00 |
| 22 | Шкаф холодильный R1400 VC (инв. № 3320) | **1 200,00** | 60,00 | 120,00 |
| 23 | Шкаф холодильный ШХ-0,7 ДС(н) (инв. № 3313) | **730,00** | 36,50 | 73,00 |
| 24 | Шкаф холодильный R1400 «Рапсодия» (инв. № 3295) | **1 300,00** | 65,00 | 130,00 |
| 25 | Шкаф холодильный серии R1400L «Рапсодия» (инв. № 3301) | **1 100,00** | 55,00 | 110,00 |
| 26 | Станок точильно-шлифовальный 3К 634 (инв. № 3020) | **980,00** | 49,00 | 98,00 |
| 27 | Станок точильно-шлифовальный 3К 634 (инв. № 3021) | **1 200,00** | 60,00 | 120,00 |
| 28 | Токарно-винтовой станок 1А-62 (инв. № 3018) | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |
| 29 | Машина разгрузочно-моечная МРМ Х940М (инв. № 3290). Компрессор МК-3-100 (инв. № 3304) | **7 000,00** | 350,00 | 700,00 |
| 30 | Хладотермостат ХТ-3/70-1 (инв. № 3185) | **970,00** | 48,50 | 97,00 |
| 31 | Ларь морозильный ELCOLD EL 53 (4 корзины, замок) (инв. № 3318) | **400,00** | 20,00 | 40,00 |
| 32 | Ларь морозильный ELCOLD EL 61 (4 корзины, замок) (инв. № 3329) | **180,00** | 9,00 | 18,00 |
| 33 | HD10/21 Plus аппарат выс. давл. без подогрева воды (инв. № 3186) | **700,00** | 35,00 | 70,00 |
| 34 | Автоклав ВК-30 (инв. № 3179) | **2 700,00** | 135,00 | 270,00 |
| 35 | Ванна нерж. 1630*550*860 гл (инв. № 3225) | **400,00** | 20,00 | 40,00 |
| 36 | Ванна нерж. 1630*550*860 гл (инв. № 3226) | **400,00** | 20,00 | 40,00 |
| 37 | Ванна ВК (2 шт.) (инв. № 3230) | **800,00** | 40,00 | 80,00 |
| 38 | Ванна металлическая (6 шт.) (инв. № 3122). Контейнеры для дефростации рыбы (23 шт.) (инв. № 3111) | **3 612,00** | 180,60 | 361,20 |
| 39 | Вентилятор YWF4S-630 BD (инв. № 3447) | **190,00** | 9,50 | 19,00 |
| 40 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3442) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 41 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3443) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 42 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3444) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 43 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3445) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 44 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3446) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 45 | Вентилятор ВР80-75 2,5 (0,25/1500) (инв. № 3337). Термодымокамера УК-3 (камера коптильная) (инв. № 3206) | **3 330,00** | 166,50 | 333,00 |
| 46 | Водонагреватель проточный 15 кВт (инв. № 3256) | **150,00** | 7,50 | 15,00 |
| 47 | Вышка-тура (2.0х1.2) 5,2 м (инв. № 3451) | **100,00** | 5,00 | 10,00 |
| 48 | Диван угловой с креслом (инв. № 5018) | **110,00** | 5,50 | 11,00 |
| 49 | Дробильная установка (инв. № 3123) | **150,00** | 7,50 | 15,00 |
| 50 | Дровокольный станок (инв. № 3096) | **150,00** | 7,50 | 15,00 |
| 51 | Дымогенератор (инв. № 3104) | **2 000,00** | 100,00 | 200,00 |
| 52 | Дымогенератор (инв. № 3129) | **2 200,00** | 110,00 | 220,00 |
| 53 | ИРФ-454-Б2М (инв. № 3184) | **1 000,00** | 50,00 | 100,00 |
| 54 | Камера холодильная 2000х3500х2240 (инв. № 3281) | **3 000,00** | 150,00 | 300,00 |
| 55 | Компрессор СБ4/С 100LH 20A (инв. № 6009) | **830,00** | 41,50 | 83,00 |
| 56 | Компьютер «CDL-pro» Celeron (инв. № 3192) | **220,00** | 11,00 | 22,00 |
| 57 | Компьютер «CDL-pro» Celeron (инв. № 3191) | **190,00** | 9,50 | 19,00 |
| 58 | Компьютер (комплект) (инв. № 3284) | **510,00** | 25,50 | 51,00 |
| 59 | Компьютер (комплект) (инв. № 3285) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 60 | Компьютер (комплект) (инв. № 3286) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 61 | Компьютер (комплект) (инв. № 3287) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 62 | Компьютер (комплект) (инв. № 3288) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 63 | Компьютер (комплект) (инв. № 3389) | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| 64 | Компьютер (комплект) (инв. № 3251) | **110,00** | 5,50 | 11,00 |
| 65 | Компьютер (комплект) (инв. № 3252) | **230,00** | 11,50 | 23,00 |
| 66 | Компьютер (комплект) CEIERON (инв. № 3232) | **230,00** | 11,50 | 23,00 |
| 67 | Компьютер (ПЭВМ «CDL-pro». Монитор «BenQ») (инв. № 3191) | **200,00** | 10,00 | 20,00 |
| 68 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3331) | **310,00** | 15,50 | 31,00 |
| 69 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3332) | **310,00** | 15,50 | 31,00 |
| 70 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3333) | **230,00** | 11,50 | 23,00 |
| 71 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3334) | **230,00** | 11,50 | 23,00 |
| 72 | Компьютерный комплекс (инв. № 3250) | **520,00** | 26,00 | 52,00 |
| 73 | Компьютерный комплекс (инв. № 3251) | **520,00** | 26,00 | 52,00 |
| 74 | Компьютерный комплекс (инв. № 3252) | **520,00** | 26,00 | 52,00 |
| 75 | Компьютерный комплекс (инв. № 3453) | **190,00** | 9,50 | 19,00 |
| 76 | Контейнер с крышкой BIG BOX (инв. № 3306) | **77,00** | 3,85 | 7,70 |
| 77 | Контейнер с крышкой BIG BOX (инв. № 3307) | **77,00** | 3,85 | 7,70 |
| 78 | Контейнер с крышкой BIG BOX (инв. № 3308) | **77,00** | 3,85 | 7,70 |
| 79 | Контейнер с крышкой BIG BOX (инв. № 3309) | **77,00** | 3,85 | 7,70 |
| 80 | Контейнер с крышкой BIG BOX (инв. № 3310) | **77,00** | 3,85 | 7,70 |
| 81 | Копировально-множительный аппарат XEROX WC PE-16E (инв. № 3149) | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| 82 | Копировальный аппарат AR-5316 (инв. № 3253) | **310,00** | 15,50 | 31,00 |
| 83 | Коптильный конвейер (инв. № 3120) | **4 700,00** | 235,00 | 470,00 |
| 84 | Коптильный контейнер СК-2 (32 шт.) (инв. № 3103) | **4 160,00** | 208,00 | 416,00 |
| 85 | Котел варочный К-50 «Jugema» (инв. № 3280) | **7 500,00** | 375,00 | 750,00 |
| 86 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3209) | **2 000,00** | 100,00 | 200,00 |
| 87 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3210) | **2 000,00** | 100,00 | 200,00 |
| 88 | Кран-балка (инв. № 3033) | **900,00** | 45,00 | 90,00 |
| 89 | Линия производства рыбных пресервов (инв. № 3196) | **3 400,00** | 170,00 | 340,00 |
| 90 | Машина вакуум-упаковочная WEBOMATIK E15 (инв. № 3146) | **7 000,00** | 350,00 | 700,00 |
| 91 | Мебель кухонная (инв. № 3440) | **1 100,00** | 55,00 | 110,00 |
| 92 | Мебель обеденная (инв. № 3441) | **810,00** | 40,50 | 81,00 |
| 93 | Мини АТС (с телеф. аппаратурой 9 шт.) (инв. № 3241) | **1 200,00** | 60,00 | 120,00 |
| 94 | Напольная вакуум-упаковочная машина WEBOMATIC ECOM (инв. № 3274) | **2 300,00** | 115,00 | 230,00 |
| 95 | Печь камерная (инв. № 3128) | **13 500,00** | 675,00 | 1 350,00 |
| 96 | Печь камерная (инв. № 3143) | **13 600,00** | 680,00 | 1 360,00 |
| 97 | Принтер TSP TTP 244 термотрансферный (инв. № 3335) | **250,00** | 12,50 | 25,00 |
| 98 | Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3049) | **260,00** | 13,00 | 26,00 |
| 99 | Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3052) | **120,00** | 6,00 | 12,00 |
| 100 | Смеситель для получения однородного рассола с насосом (инв. № 3339) | **2 600,00** | 130,00 | 260,00 |
| 101 | Стеллажи (2 шт.) (инв. № 3112) | **84,00** | 4,20 | 8,40 |
| 102 | Тел./факс «Panasonik KXFT 31 RS» (инв. № 3061) | **50,00** | 2,50 | 5,00 |
| 103 | Тел./факс «Панасоник» (инв. № 3093) | **50,00** | 2,50 | 5,00 |
| 104 | Теплосчетчик ТЭМ 05М (инв. № 3207) | **56,00** | 2,80 | 5,60 |
| 105 | Термотуннель ТПЦ-550Р (инв. № 3178) | **1 100,00** | 55,00 | 110,00 |
| 106 | Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3254) | **140,00** | 7,00 | 14,00 |
| 107 | Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3255) | **100,00** | 5,00 | 10,00 |
| 108 | Фасовочно-упаковочная линия (инв. № 3195) | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| 109 | Холодильный агрегат АМ-2х6Н 25Y-CL-DK (инв. № 3176) | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |
| 110 | Шкаф ШСС-200 (стерилизатор) (инв. № 3181) | **1 300,00** | 65,00 | 130,00 |
| 111 | Шлифмашина углов. BOSCH GWS 22-230H (инв. № 3343) | **120,00** | 6,00 | 12,00 |
| 112 | Эл. двигатель 5AM S6-45/1000 (инв. № 3249) | **1 500,00** | 75,00 | 150,00 |
| 113 | Торговый павильон (инв. № 0056) | **1 400,00** | 70,00 | 140,00 |
| 114 | Платформа вес 4D-P-2-1000 с систем идентификации SI4D-A (инв. № 3338) | **890,00** | 44,50 | 89,00 |
| 115 | Автомобиль ГАЗ 3307 КУПАВА 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6423-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3340) | **7 640,00** | 382,00 | 764,00 |
| 116 | Автомобиль ГАЗ 3307 КУПАВА 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341) | **7 640,00** | 382,00 | 764,00 |
| 117 | Автомобиль ГАЗ 4738, год выпуска – 2005, рег. № АА 3268-3, тип ТС – грузовой фургон изотермический, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый | **5 000,00** | 250,00 | 500,00 |
| 118 | Автомобиль GAZ 3309, год выпуска – 2012, рег. № AI 7768-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, условно-пригодное техническое состояние, цвет – белый | **9 200,00** | 460,00 | 920,00 |
| 119 | Автомобиль GAZ 3302 KUPAVA 232500, год выпуска – 2010, рег. № АЕ 7796-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – оранжевый | **5 500,00** | 275,00 | 550,00 |
| 120 | Автомобиль GAZ 2752, год выпуска – 2003, рег. № AI 0015-3, тип ТС – грузопассажирский вагон, удовлетворительное техническое состояние, цвет – сине/зеленый | **3 400,00** | 170,00 | 340,00 |
| 121 | Навесное оборудование погрузчика ПО-26, год выпуска – 2012, удовлетворительное техническое состояние (инв. № 3356) | **300,00** | 15,00 | 30,00 |
| 122 | Автопогрузчик ДВ-1792, год выпуска – 1988, условно-пригодное техническое состояние (инв. № 3454) | **1 700,00** | 85,00 | 170,00 |
| 123 | Автопогрузчик TOYOTA 62 8FD15 V2700, год выпуска – 2008, удовлетворительное техническое состояние (инв. № 3279) | **14 200,00** | 710,00 | 1 420,00 |
| 124 | Прицеп 2ПТС4, 1983 года выпуска, зав. № – нет данных, рег. № ЕВ 3711-1 (инв. № 4005) | **2 300,00** | 115,00 | 230,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (044) 534-93-34 – Петрушенко Михаил Михайлович, 8 (044) 733-03-49 – управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 сентября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 12 октября 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст.127–129. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# Чамадан з цукеркамі

На двары загаўкаў, а потым пачаў шалянець ад таго, што ніхто яго не чуе і не ідзе на яго папераджальны гаўк, Шарык.

— Ау, хто ёсць у хаце? — пачулі Дарынка са старэйшым братам Шуркам чыйсці чужы мужчынскі голас.

Дзеці аж папруцянелі ад страху: маці недзе ў хляве доіць карову, старэйшыя сястра з братамі ў школе, бацька яшчэ не прыйшоў з работы, а яны адны ў хаце. Добра, што калі толькі загаўкаў сабака, яны муталем ускочылі на печ — чужынец не адразу іх у прыцемку разгледзіць і знойдзе. Прыціснуўшыся адно да аднаго, яны выглянулі з-за коміна: каля парога кухні, аглядаючыся, стаяў нейкі высокі мужчына ў вайсковай форме. Вось ён зняў з-за пляча мяшок з супонькамі і паклаў яго на табурэтку. Каля яе ж паставіў і чамадан. Потым развярнуўся і выйшаў на двор. Зноў загаўкаў-зайшоўся Шарык.



— Хто ета такі? — шэптам запытаў саму сябе Дарынчын брат. — Мо які злодзей? Але ж злодзей не будзе свой чамадан кідаць з мяшком. А мо бацькаў знаёмы ці начальнік? — працягваў гадаць брат. На меншую сястру, якая была на два гады малодшая за яго, ён не разлічваў: адкуль малая будзе ведаць і чым тут яна яму дапаможа, калі і сам ён нічога не разумее. Шурка ўжо сабраўся быў саскочыць з печы і ўхапіць у качарэжніку хоць бы ёмку, каб было чым адбівацца ад злодзея, але не паспеў — у сенцах пачуўся бразгат даёнкі, радасны голас мацеры і бас таго незнаёмца.

— Зараз, зараз, даражэнькі, я лямпу засвячу. Бач, як хутка зараз цямнее: ішла ў хлеў, дык яшчэ відно было, а пакуль падаіла Лыску, дык і змерклася. А я думаю, чаго ета наш Шарык разрываецца, каго там, на ноч гледзячы, нясе чужога? А тут ты, аказваецца, — прыгаворвала маці, увіхаючыся каля лямпы. Падкруціўшы кнот, каб было святлей, яна, нарэшце, абярнулася да незнаёмца і абняла, прыгарнула яго да сябе, прыгаворваючы-прычытаючы:

— А мой ты Іванка, а мой ты даражэнькі хлопчык, а які ж ты вымахаў высачэнькі, а цябе ж ужо і не дастаць — ты ж як тая драбіна стаў. Дай хоць пагляджу на цябе, родненькі! А чаму ж ты не напісаў, мы б жа стрэлі цябе на станцыі? Хіба няма каму? Перапалохаў сваім сюрпрызам. На матку-пакойніцу падобны, бач, і кропелькі пабраў, — маці правяла рукой па правай шчацэ вайскоўца, дзе была відна радзімка.

Дарынка з братам з печы, раскрыўшы раты, сачылі за ўсім тым незразумелым дзействам, што разгортвалася на іх вачах.

— Мама, хто ета такі? — першы схамянуўся Дарынчын брат, — каго ета ты абдымаеш?

Ён на правах старэйшага заўсёды выскакваў наперад і па характары ён быў больш цікаўны за сястру. Маці называла яго яшчэ «малы ўеднік». Яна не паспела нічога адказаць, а мо не захацела, а толькі шчасліва ўсміхнуўшыся і глянуўшы на таго вайскоўца, кіўнула яму:

— Паглядзі на печ — там меншая шуядзь, а большыя ў школе яшчэ, на другой змене. Ці пазнаеш, выраслі, пакуль не бачыліся. Вой, мне ж малако трэба працадзіць і свінням яшчэ вынесці. Зараз абярнуся і будзем стол збіраць-гатаваць. Такі госць здарыўся! — радасная і шчаслівая, маці кінулася да даёнкі і гладышак.

Незнаёмец наблізіўся да печы і, засмяяўшыся, працягнуў рукі: — А ну, скачыце да мяне хутчэй, шуядзь, я хоць вас разгледжу. А што я вам прывёз!

Малыя пераглянуліся і не падумалі нават скакаць на рукі незнаёмца. Яшчэ чаго ўздумаў, што яны, дурныя? Абзываецца яшчэ.

— Ты хто? — смела запытаў Шурка, бо знаходзіўся на вышыні і ў хаце была маці. Дарынка толькі паглядала на таго дзядзьку.

— Што, не пазнаў брата, Шурык? А ты, Дарынка? Я ж фотаздымак вам прысылаў?

— Унё, якога яшчэ брата? Нашы браты і сястра зараз у школе, ты не брат, мы цябе не ведаем. Праўда, Дарынка? — запярэчыў хлопчык. Малая ў знак згоды толькі кіўнула галавой.

— Не пазналі, значыць? Я ж Іван з Калінкавіч, ваш стрыечны брат. Цёткі Фені пакойнай сын. Ваша маці — мая родная цётка.

— А і праўда, Дарынка. Гэта ж той наш Іван з картачкі на стале ў зале, — прашаптаў прама на вуха сястры брат. — Хадзем злазіць, цяпер не страшна.

Першы асмеліўся злезці з печы, канешне, брат. Толькі пасля яго спусцілася і Дарынка. Той Іван-брат адразу падхапіў Шурку і падкінуў да столі, а потым туды ж узляцела і Дарынка. У яе аж дых заняло ад страху і радасці адначасова. Яе яшчэ так моцна абдымаў і цалаваў той брат, прыгаворваючы пры гэтым:

— Ты бач, як выраслі — не пазнаць малечу. Ды дзе там пазнаеш, калі апошні раз прыязджаў, ты, Дарынка, у люльцы яшчэ спала, а твой брат вось такі быў, — і паказаў на сваё калена. «Шуядзь» стаяла, прывыкала да новага брата і з нецярплівасцю чакала, пакуль ён ужо выгаварыцца і пачне даваць ім гасцінцы: сам жа боўтнуў, як кажа іх маці, што штосьці там прывёз.

А той, нацешыўшыся малымі і зразумеўшы іх нецярплівыя пярэглыды паміж сабой, ступіў (нарэшце) да свайго чамадана. Паставіўшы яго на табурэтку, пстрыкнуў замочкамі і падняў крышку. Ад пабачанага малыя анямелі: чамадан быў поўны цукерак у рознакаляровых абгортках. Сказаць, што яны ў вочы не бачылі тых цукерак і ніколі не каштавалі — было б вялікім грэхам. Бацькі, няхай і зрэдку, але падсалоджвалі жыццё сваіх дзяцей гасцінцамі. Раз на месяц, напрыклад, калі іх бацька ездзіў здаваць свой «адчот» да Гомеля ў нейкую «дыстанцыю», дык ніводнага разу не вяртаўся дадому з пустымі рукамі. На стол урачыста выкладваліся каржы-пеўні з павідлавымі вачыма, з паўкіло падушачак або маленькіх ледзянцоў — «лампасе», вязанкі баранкаў і рабрыстая бутэлька з якім-небудзь сіропам. Асабліва смачны быў малінавы. Сіроп маці тут жа хавала ў скрыню, каб потым, калі хто з дзяцей захварэе, даваць па лыжцы для запівання ненавіснага рыбінага тлушчу. Перападалі малым гасцінцы і на дзяржаўныя святы — Новы год, 1 Мая, 9 Мая, 7 Лістапада («на Акцябрскую»), якія святкаваліся ў іх пасёлку-станцыі і на якія дахаты з'язджалася радня і госці з суседніх станцый. Дык жа не з пустымі рукамі яны заходзілі ў хату — ад гарадскіх гасцей на кожнага прыпадала па некалькі цукерак у абгортках, па перніку, а ад мясцовых — па жмені гарбузовых ці сланечнікавых семак, або арэхаў-лузанцоў. Але ж ніхто з іх ні разочку не прывозіў малым цэлы чамадан такога дабра — ракавых шыек, сняжкоў, дзюшэсу, ластавак, залатых ключыкаў. Нават бачыць столькі адразу не давялося.

— Ого! Гэта ўсё нам? — выгукнуў Шурка?

— Ого! Як багата! У Галькі няма столькі! — выгукнула ўслед за братам Дарынка.

— Якой Галькі? На ўсёй вуліцы разам ні ў кога столькі няма! — падвёў вынікі агледзін чамадана Шурка.

Да чамадана падышла маці і таксама ахнула:

— Іванка, нашто ж ты так патраціўся? Ты, мабыць, усе свае зберажэнні гахнуў? Гэтай жа чэмеры колькі ні дай тых цукерак, дык усё мала будзе.

— А вось і не мала, а багата нам Іван прывёз цукерак, — глянула знізу ўверх на свайго новага брата, які стаяў і шчасліва ўсміхаўся, Дарынка, і ўзяла яго за руку. Прызнала, значыць.

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

■ Знарок не прыдумаеш

# НІЧОГА, ПРАРВЁМСЯ,

## або Купанне Настачкі



**Першае купанне нованароджанага немаўляці — не проста «працэдура». У беларусаў — гэта амаль што абрадавая падзея, накшталт першага прычасця. У даўнейшыя часы на першае купанне запрашалі найбольш дасведчаную і вопытную кабету, абавязкова добрую, чулую, незайздросную, каб, не барані бог, не сурочыла дзіцятка! За гэтую паслугу абавязкова належыла заплаціць хоць невялікія грошы купальшчыцы, якую з гэтага часу называлі «бабкай», прычым нягледзячы на ўзрост.**

Сёння гэтая традыцыя амаль што знікла. Маладыя мамачкі самі купаюць сваіх немаўлятак, бо вучацца гэтаму яшчэ да нараджэння дзіцяці ў кансультацыях і паліклініках.

...Настачка нарадзілася сямімесячнай. Хоць і патрымалі яе ў бальніцы значны тэрмін, але яна ўсё роўна больш нагадвала нейкага галавасціка, чым дзіця: вялікая галоўка, сплюшчаны, нібы печаны яблык, тварык, худзенькія ручкі і ножкі. Маладыя бацькі нават спачатку яе баяліся. Калі ж спатрэбілася тэрмінова пакупаць дзіця, яны і ўвогуле вырашылі звярнуцца па дапамогу да суседкі па пляцоўцы — бабы Валі. Ніхто не ведаў, ці ёсць у бабы Валі свае дзеці, бо ніколі не бачылі іх, аднак усім суседзям было вядома, што Валянціна Пятроўна — ветэран вайны. Ды і што казаць, жанчына яна была энергічная, дзелавітая, напорыстая. Увесь дом звяртаўся да яе па парады, па дапамогу, і не было выпадку, каб яна каму-небудзь адмовіла. Толькі скажа: «Нічога — на фронце і не такое было!»

Не адмовіла баба Валя і нашым маладым, адразу загадала: «Рыхтуйце начоўкі, — і дадала: — Прарвёмся: на фронце і не такое было».

Тата Вова наліў вады ледзьве не па самыя берагі, па загадзе бабы Валі крыху падфарбавалі ваду марганцоўкай. Апусціўшы локаць у ваду, мама Вера праверыла ці не загарачая яна. І Валянціна Пятроўна, распавіўшы дзяўчынку, падхапіла яе пад ручкі і асцярожна апусціла ў ваду...

Галоўка немаўляці, якая спачатку хісталася ўправа-ўлева, раптам «зафіксавалася» на паверхні вады, як паплавок; ножкі, якія да гэтага былі падціснуты пад жывоцік, напружыліся і нібы пачалі шукаць дно, каб у што ўперціся. Настачка, відаць, упершыню за сваё кароценькае жыццё шырока расплюшчыла вялікія шэрыя, нібы мышкі-палёўкі, вочкі і... усміхнулася.

Па загадзе Пятроўны мама Вера пачала мыць дачушцы галоўку, паліваючы цёплай вадой з чайніка. Тым часам баба Валя памяняла «дыспазіцыю», паклаўшы немаўля гарызантальна, а маладая мама пераключылася на жывоцік і ножкі.

Калі працэдура была завершана і дзяўчынку дасталі з цёплай вады, высветлілася, што бацькі не падрыхтавалі ручнік. Каб не застудзіць немаўля, баба Валя, нядоўга думаючы, спрытна выбегла з Настачкай з ваннага пакойчыка ў спальню, дзе на ложку ляжаў забыты ручнік...

Карацей, усё абышлося, дзіця не захварэла. А крыху пазней высветлілася, што Валянціна Пятроўна хоць і была на фронце, але не ў якасці медсястры, як лічылі ўсе суседзі, а ў якасці снайпера.

**Ала КЛЕМЯНОК**

■

# ЭЛЕКТРОННАЯ «ДЫЕТА»

## Дзеці і гаджэты: да чаго прыводзіць празмернае захапленне

**Апошнім часам усё часцей можна пабачыць дзяцей самага рознага ўзросту, нават малых, якія гуляюць у планшэт ці глядзяць мульцікі на маміным тэлефоне, прычым упраўляюцца з імі зусім як дарослыя... Гаджэты трывала ўвайшлі ў наша жыццё, часта замяняючы жывое кантактаванне.**



### Губяць зрок і не толькі

Тым часам бескантрольнае іх выкарыстанне вядзе да павелічэння рызыкі ўзнікнення міяпіі (блізарукасці), а таксама прагрэсіравання міяпіі ў тых дзяцей, якія маюць гэты дыягназ.

— Розныя праблемы са зрокам у большасці людзей узнікаюць яшчэ ў дзяцінстве, таму дарослым варта клапаціцца аб захаванні і ўмацаванні зроку ў свайго дзіцяці, асабліва ў тых выпадках, калі існуюць спадчынныя фактары (у кагосьці з блізкіх сваякоў ёсць парушэнні зроку) ці ў дзіцяці пачынае пагаршацца зрок, — тлумачыць **урач-афтальмолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай палiклінікі г. Мінска Наталля МАЦЕЙКА.**

Акрамя відавочнай сувязі са зніжэннем зроку, ёсць і некаторыя іншыя сумныя навіны. У якасці прыкладу Наталля Мацейка прыводзіць даследаванне каліфарнійскіх вучоных, якія ў 2014 годзе правялі эксперымент. Яны стварылі дзве групы дзяцей (у першай 54 дзіцяці, у другой — 51). Першай групе раздалі тэлефоны і папрасілі карыстацца імі пастаянна на працягу пяці дзён, другая група актыўна праводзіла час на свежым паветры. Пасля заканчэння эксперымента высветлілася, што дзеці з першай групы горш праяўлялі эмоцыі, часам не разумелі, што адчувае суразмоўнік, у той час як у другой групы здольнасць вызначаць эмоцыі была значна вышэйшай.

— Праводзіліся даследаванні аб уплыве яркага святла ад планшэта на выпрацоўку мелатаніну — гармону, неабходнага ў тым ліку і для сну. Высветлілася, што выкарыстанне планшэта на працягу дзвюх гадзін у дзень у рэжыме яркай падсветкі змяншае канцэнтрацыю мелатаніну, адпаведна, часцей развіваецца бессонніца, стамляльнасць, раздражнёнасць, — кажа суразмоўніца. — Вывучаецца і ўплыў сіняга спектра святла ад гаджэтаў на стан сятчаткі. Справа ў тым, што ў дарослых хрусталік змяншчае болей жоўтага пігменту, які з'яўляецца своеасаблівым фільтрам для сінега колеру, у той час як хрусталік дзіцяці больш празрысты і светлы. Сіні колер можа садзейнічаць развіццю паталогіі сятчаткі ў дарослым узросце.

### Як мінімізаваць шкодны ўплыў

Пачнём з выбару самога гаджэта. Тут важная дыяганаль экрана, бо чым меншы экран, тым мацней напружваюцца вочы. Таму планшэт з дыяганаллю экрану 10 цаляў лепшы, чым 7-цалёвы.

Чытаць трэба седзячы, лепш паставіць гаджэт на цвёрдую паверхню, каб адлегласць ад вачэй дзіцяці да экрана не мянялася (у сярэднім яна павінна складаць 30 сантыметраў ці адлегласць ад кончыкаў пальцаў да локця дзіцяці). Не рэкамендуецца чытаць ці гуляць у транспарце, які рухаецца. Яркасць экрана неабходна рэгуляваць, напрыклад, прыходзячы з вуліцы ў памяшканне зменшыць. У цёмны час сутак абавязкова павінна быць дадатковая крыніца святла.

— Часта ад бацькоў можна пачуць пытанне пра тое, колькі часу можна праводзіць за планшэтам у два гады, — працягвае Наталля Мацейка. — Але ў такім узросце дзіця павінна актыўна пазнаваць свет, выкарыстоўваючы ўсе органы пачуццяў, а не ў планшэце сядзець! Сумарны час, праведзены перад тэлевізарам, планшэтам, камп'ютарам у дзяцей з 5-7 да 14 гадоў не павінен перавышаць дзве гадзіны. Кожныя 20—30 хвілін такой нагрузкі неабходна рабіць перапынак, і пажадана, каб ён быў звязаны з фізічнай актыўнасцю — гульнёй ці дапамогай бацькам па доме. Таксама трэба рабіць зрокавую гімнастыку.

Гуляючы з дзіцем на вуліцы, звяртайце яго ўвагу на дэталі пры кожным зручным выпадку (хвост птушкі, вусы кошкі, каменьчыкі, кветкі), разглядайце далёка і блізка размешчаныя прадметы, чаргуючы іх. Прагулкі і свежае паветра надзвычай карысныя для вачэй, як і заняткі такімі відамі спорту, як плаванне, настольны тэніс, бег. Харчуйцеся правільна ў адпаведнасці з узроставым рацыёнам, не забываючы ўключаць карысныя для вачэй прадукты: чарніцы, морква, абляпіху, зеляніну, фрукты, мяса, рыбу.

Хоць бы гадзіну ў дзень размаўляйце з дзіцем, арганізуйце сумесны адпачынак (тэатр, музей, пікнік, гульні на свежым паветры).

— Бацькі часта кажуць, што немагчыма абмежаваць выкарыстанне гаджэтаў, — кажа спецыяліст, — але, напрыклад, усім вядомы Біл Гейтс абмяжоўваў сваіх дзяцей у выкарыстанні гульнявых прыставак і камп'ютара, а Стыў Джобс кожны раз вячэраў з сям'ёй, размаўляў пра кнігі і гісторыю, і ніхто ў гэты час не даставаў планшэт.

**Алена КРАВЕЦ.**

■ Нататкі шматдзетнага таткі

# ЛАПАТА ДЛЯ ЛАВЫ

**Ну прывітанне, восень. Атрымаў запрашэнне адразу на два бацькоўскія сходы. Увахоп, як заўсёды, бясплатны. Кошт выхаду будзе вызначацца на месцы. Метад вызначэння: падсумоўванне выпадковых лічбаў. Спосаб аплаты: наяўна-launа-ментальны. Цяпер збіраю грошы, пакольки брацы трэба з запасам (калі хочаш выйсці жывым). З жахам думаю, што хутка ў мяне будзе чацвёра школьнікаў.**

P. S. Як там у класіка: самотная пара, вачэй зачараванне? Не, усё значна празаічней. Проста рыхтуйце бабкі, а рамантыку пакіньце паэтам.

* * *

Сын схадзіў першы раз на гуртоk па біялогіі. Спытаў яго, чым займаліся. Сказаў: «Вывучаў у мікраскоп размнажэнне водарасцяў». На пытанне: «Што, усе чатыры гадзіны?» — сказаў: «Дык яны ж павольна размнажаюцца!» Карацей, калі вы не ведаеце, як правесці выхадны дзень, запішыцеся на гурток па біялогіі.

* * *

Старэйшая дачка пела малодшым калыханку. Пачуў толькі канцоўку, але мне хапіла: «Прыйдзе дзядуля Бабай і адключыць вам вайфай». Вось яны — страхі дзяцей XXI стагоддзя. Шэранькі ваўчок нервова курыць бычок.

* * *

Рэакцыя жонкі, калі я паведаміў ёй, што забраў кніжкі з друкарні: «Віншую! Спадзяюся, цяпер ты, нарэшце, адрамантуеш вечка ад унітаза».

А вы думаеце, нам, паэтам, лёгка? Нічога падобнага. Але накапт вечка я б не абнадзейваўся: спачатку трэба рэалізаваць тыраж.

* * *

Жонка расказала: ішла ўчора з малодшымі па вуліцы, трымала іх за рукі. Раптам Вера адпускае руку і кажа: «Мама, я пайду пабегаю. Толькі ты гэту ручку Полі не аддавай — я хутка вярнуся». Усё правільна: у жыцці дзюбай не шчоўкай.

* * *

Ішоў зараз у белым халаце па бальнічным вестыбюлі. На лаўцы сядзеў хлопчык гадоў пяці з мамай. Калі я праходзіў міма, ён шэптам, поўным захаплення, спытаў:

— Мама, а гэта доктар? Ён людзей лечыць?

Не ведаю, што адказала мама, але мне вельмі хацелася спыніцца і сказаць:

— Пра Айбаліта чуў?

— Так.

— Я.

І было б у хлопчыка ўражанне на ўсё жыццё.

А так мама напэўна сказала якую-небудзь банальнасць тыпу:

— Не, сынок, гэта дзядзя проста прыйшоў наведаць кагосьці ў бальніцы.

З дарослымі кашы не зварыш, гэта, як той казаў, медыцынскі факт.

* * *

Будзіў старэйшых дзяцей у царкву. Дачка, як звычайна, ні ў якую не хацела ўставаць. Я ўжо і свет уключыў, і падушку забраў, і тармасіў яе — безвынікова. І раптам, калі зусім адчаяўся, мяне асяніла, і я сказаў: «А хочаш потым пайсці ў Бургер Кінг?» У тую ж секунду дзіця ўжо адзявалася, я нават спужаўся. А вы кажаце, няма карысці ад фастфуду.

P. S. Наступным разам буду перш-наперш казаць: «Прачынайся, ідзём у Макдональдс». Сэканомлю і час, і нервы.

**Павел ХОЛАД**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## ВЯЛЕНЫЯ СЛІВЫ



***Усе хоць раз у жыцці каштавалі вяленыя памідоры. Але няшмат тых, хто паспытаў на смак вяленыя слівы — закуску з кісла-салодкім смакам. Такія слівы можна дадаваць у салаты, яны могуць служыць начынкай для выпечкі, выдатна дапоўняць стравы з мяса птушкі або рыбы.***

***Спатрэбіцца:*** *мясістыя сакавітыя слівы, каб костачка лёгка аддзялялася, — 0,5 кг; сушаныя травы: чабор — 0,5 ч. л.; мята — 0,5 ч. л.; базілік — 0,5 ч. л.; маяран — 0,5 ч. л.; соль — 1 ч. л.; віннЫ воцат — 50 мл; часнок — 2 зуб.; аліўкавы алей (можна замяніць сланечнікавым, але толькі рафінаваным) — 75 мл.*

З рэзкімі прыправамі можа паэксперыментаваць. Цікавае спалучэнне — каляндра, чабор і чорны перац.

Слівы разрэжце на палавінкі і выдаліце костачкі. Дадайце травы і здробнены часнок. Акуратна змяшайце.



На бляху, засланую пергаментам, выкладзіце палавінкі сліў. Ставім бляху ў духоўку, разагрэтую да 60—70 °C на паўтары гадзіны, пасля чаго трэба пакінуць прачыненай духоўку яшчэ на 3-4 гадзіны.

Астылыя слівы выкладаюць у стэрыльныя слоікі пластамі і заліваюць сумессю аліўкавага алею і воцату. Закрыты слоік адпраўце ў халадзільнік. Праз 7-8 гадзін можна паласавацца!

Асабліва пашанцавала ўладальнікам спецыяльнай сушкі для агароднiны і садавіны: устанавіце тэмпературу 70—80 °C і пасушыце слівы гадзіну, затым памяншыце тэмпературу да 40—50 °C і пакіньце яшчэ на пару гадзін.

Для нарыхтоўкі лепш за ўсё карыстацца слоікамі невялікага аб'ёму з накрыўкай, якая закручваецца. Вяленыя слівы, як і папулярныя вяленыя памідоры, выдатна захоўваюцца ў халадзільніку да паўгода!

ШКОЛА ЭКАНОМІІ

## За якія функцыі пральнай машыны не варта пераплачваць?

***Купляючы бытавую тэхніку, мы часта выбіраем прылады з наборам пэўных функцый не таму, што сапраўды разумеем, навошта гэтыя функцыі нам патрэбныя, а проста «на ўсякі выпадак» ці ў нагрузку да ўпадабанага дызайну.***

Паспрабуем скласці пералік сапраўды актуальных у паўсядзённай эксплуатацыі функцый і аптымальных характарыстык.

**Патрэбныя функцыі:**

- адцісканне 1000—1200 аб./хвіл.;
- дысплей з індыкацыяй дадатковых рэжымаў і часу, які застаўся да канца мыцця;
- мыццё пры 90 °C (дапамагае пры асабліва моцных забруджаннях або калі патрабуецца пазбавіцца, напрыклад ад пылавых кляшчоў);
- функцыя сушкі: калі дома няма месца для развешвання бялізны;
- клас энергаэфектыўнасці A ці A+.

**Марныя траты:**

- адцісканне 1400 і больш аб./хвіл. Не ўсякая тканіна гэта вытрымае;
- каляровы экран з графічным інтэрфейсам. На якасць мыцця не ўплывае;



- функцыя мыцця парай. За рэдкім выключэннем, па сваёй эфектыўнасці эквівалентная мыццю пры 90 градусах, але значна даражэйшая ў рэалізацыі;
- мноства дадатковых праграм. Памятайце, што праграма — гэта толькі алгарытм руху барабана і нагрэву вады. Як правіла, сярод 15—20 базавых праграм заўсёды можна знайсці прыдатную для мыцця практычна любых рэчаў. Плаціце толькі за тыя праграмы, якімі гарантавана будзеце карыстацца, прычым часта;
- функцыя сушкі. Можна сэканоміць нямала электрычнасці і вады, калі дома шмат месца для развешвання бялізны і выгляд «пральні» вас не напружвае;
- клас энергаэфектыўнасці A++. У рэальнасці не так ужо моцна зніжае кошт мыцця (таму што асноўныя выдаткі — гэта сродак для мыцця і кандыцыянер для бялізны), але пры гэтым з'яўляецца важным маркетынгавым інструментам.

*У КАГО ДОЧКІ, ТОЙ ХОДЗІЦЬ БЕЗ САРОЧКІ. (Беларуская прыказка)*



■ Руплівым гаспадарам

# ЧАМУ АЖЫНЫ НЕ КОЛЮЦЦА, А МАЛІНЫ ХОДЗЯЦЬ?

## Сакрэты новых сартоў

**Пры жаданні сёння можна вырасціць маліны розных колераў — чырвоныя, жоўтыя, фіялетавыя, чорныя, рынак прапануе садаводам і многа разнастайных сартоў ажын, у тым ліку з ягадамі даўжынёй з пачак запалак. Вось толькі ці трэба спакушацца на такія экзатычныя навінкі? Паспрабуем разабрацца разам з загадчыкам лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур Інстытута пладаводства Людмілай ФРАЛОВАЙ.**

### Праблема з зімастойкасцю вырашаная

Мы гуляем па садах інстытута і знаёмімся з разнастайнымі сартамі. На жаль, не ўдалося сфатаграфаваць ягады чорных малін — яны адышлі (выспяваюць як летнія маліны), затое ўдалося пабачыць, як такая расліна «крочыць» — яе галінкі выгінаюцца, утвараюць дзівосныя аркі.

Звычайная чырвоная маліна, ажына і маліна чорная — гэта ўсё «сёстры» з аднаго сямейства, а ёсць яшчэ і маліна сунічная (ці тыбецкая) і арктычная (княжаніка). І ў кожнай «сястры» свае асаблівасці. І хоць чорныя маліны — ягады не такія смачныя, як чырвоныя — больш сухія, дробныя, — варта на іх звярнуць увагу. Усё таму, што ў такіх пладах багата карысных рэчываў, у тым ліку Р-актыўных, і зампежнымі вучонымі даказана, што чорныя маліны падыходзяць для прафілактыкі анказахворванняў.

У гэты час пачалі спець ягады на рэмантантных кустах — пры жаданні сюды можна прыехаць пазбіраць ураджай і адначасова прыглядзець сарты для ўласнага саду. У інстытуце выпрабоўваюць расліны, выведзеныя не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, і змогуць падказаць, з чым можна сутыкнуцца пры вырошчванні замежскіх саджанцаў. Напрыклад, навошта вам «звязвацца» з раслінамі, не прыстасаванымі пад наш клімат? Дзякуючы працы селекцыянераў розных краін праблема з зімастойкасцю малін вырашаная. Вялікая колькасць сартоў можа выдатна пераносіць беларускія зімы.

А чаму б не падабраць у садзе культуры так, каб свежыя ягады вы атрымлівалі даволі працяглы час. Я папрасіла Людмілу Уладзіміраўну скласці такі набор для пачаткоўцаў. Хочаце мець ягады з канца чэрвеня да канца ліпеня, садзіце: Метэор (самы ранні), Бальзам (сярэдні, і назва тут невыпадковая — у ягад прыемны водар), пазней выспявае Алёнушка, а пасля яе Услада. Сярод летніх беларускіх сартоў можна згадаць жоўтаплодную маліну Мядовая. Што датычыцца рэмантантных малін, вучоныя найперш раяць выбіраць з рэестра раянаваных сартоў. Так, непераборлівая пры вырошчванні Бабіна лета, раней выспявае Геракл, пазней — Хэрытэйдж. І для душы можна пасадзіць Бранскае дзіва ці Рубінавыя пацеркі. Адзін з самых папулярных жоўтых сартоў — Аранжавы цуд.



А вось па ажынах селекцыя пакуль яшчэ толькі развіваецца, і новыя папулярныя сарты з буйнымі ягадамі маюць патрэбу ва ўкрыцці на зіму. І калі вы гатовыя гэтым займацца, можаце пасадзіць у сябе такія сарты, як Торнфры, Натчэз, Чэстар, наш беларускі — Стэфан. Калі ж вы хочаце «беспраблемныя» ажыны, якія добра зімуюць і без укрыцця, выбірайце Агавам.

І зусім неабавязкова садзіць розныя сарты ў розных месцах, расліны не будуць шкодзіць адно аднаму. Хіба толькі летнія і рэмантантныя маліны лепш развесці па ўчастку, бо догляд, абрэзка тут розныя. Так, першыя даюць плады на двухгадовых парастках, а ў другіх ураджай збіраюць з «маладняку».

У летніх малін больш шкоднікаў і хвароб, яны могуць зімаваць на атожылках і на другі год праяўляцца. А рэмантантныя маліны ў адзін год далі ўраджай — і мы скошваем іх наземную частку. Ягады на іх чыстыя, бо, калі расліна квітнее, малінавы жук пайшоў у зімоўку, адкладаць яйкі няма каму. Праблемы могуць быць толькі з шэрай гніллю пладоў, асабліва пры паніжаных асенніх тэмпературах. Трэба своечасова збіраць ягады, можна зрабіць укрыццё ад дажджу.

### Ягадныя спакусы

Адна з «фішак», якую сёння прапануюць садаводам, — малінавыя дрэвы. Дастаткова было прыдумаць цікавую назву, запусціць масіўную рэкламу — і людзі ўжо запалі на «цуда-расліну». Насамрэч такія прамастаячыя маліны не трэба спяшацца садзіць на сваім участку — яны патрабуюць высокага аграфону: угнаенняў, паліваў, іх трэба садзіць у абароненых ад вятроў месцах, абавязкова ўкрываць на зіму. Інакш з такой дрэвападобнай (ці, як яшчэ могуць падаваць на рынку, штамбавай, ці маліны інтэнсіўнага тыпу) расліны вам не сабраць добрага ўраджаю. А ці гатовыя вы да лішніх турбот і выдаткаў? Ды і прышчапіце звычайныя маліны — яны пачнуць моцна адгаліноўвацца і вы атрымаеце тое ж «малінавае дрэўца». Наогул так званыя «малінавыя дрэвы» не такая ўжо і навіна. Яшчэ ў 80-х гадах расійскі селекцыянер займеў насенне з шатландскай вопытнай станцыі і пачаў выкарыстоўваць атрыманыя расліны ў сваёй працы. У выніку вывеў шэраг бясшыпных сартоў прамастаячых малін, памер ягад на якіх уражваў, вось толькі культуры аказаліся больш уразлівымі да халоднага надвор'я.

Часта прапануюць праз інтэрнэт саджанцы за капейкі. Але бывае, што пад такую «акцыю» аматарам уцюхваюць смецце — расліны з раскарчаванай старой плантацыі. Гэта як састарэлую жанчыну браць замуж і хацець ад яе дзяцей. І добра, калі з такімі раслінамі вы не занесяце на свой участак хваробы і шкоднікаў. Пасадачны матэрыял павінен быць якасны!

Важна падрыхтаваць для будучых «гадаванцаў» глебу, зрабіць яе аналіз, абавязкова трэба ведаць узровень грунтавых вод, папярэднікаў, якія на ёй працавалі. Так, фермерам могуць дастацца землі, зарослыя інвазійнымі відамі і нават забруджаныя шкоднымі рэчывамі. Напрыклад, у савецкі час на палі сыпалі дуст і іншую хімію, якая магла назапашвацца ў глебе. Так, у аднаго з гаспадароў на ўчастку сохлі маліны, хаця ні хвароб ні шкоднікаў там не было. Высветлілася, што ў спякотны перыяд расліны шукалі вільгаць і іх карані дайшлі да ніжніх слаёў, дзе быў акумуляваны гірбіцыд.

### Садзім?

Ці ведаеце вы, што ажыны бываюць кумані (гэта кусты, да якіх мы прывыкшчаілся) і расянікі — як правіла, бясшыпныя ліяны, пад якія спатрэбяцца шпалеры. Менавіта на другіх вырастаюць буйныя ягады. Расянікі і больш далікатныя. Яны могуць зімой пацярпець ад холаду, але самае крыўднае, калі пасля ўдалай зімы пупышкі на раслінах пашкоджваюцца зваротнымі замаразкамі, таму з такой культуры па вясне лепш не спяшацца здымаць спанбонд.

Расяніка, як і маліна чорная, не дае каранёвых атожылкаў, а множыцца дзякуючы ўкараненню верхалінак сваіх доўгіх галінак (так званага пульбавання). І жнівень — самы час для такой аперацыі. Прыкметай таго, што вашы расліны гатовыя да такой працэдуры, будуць лысыя парасткі (на верхавінках ліст драбнее ці сыходзіць, і сама галінка пачынае згібацца, утвараць «петлі»). Трэба прыкапаць верхавінкі, да кастрычніка расліна ўжо зможа даць карані. Пераносіць новую расліну на пастаяннае месца лепш вясной. Наогул ажыны лепш садзіць па вясне — у іх будзе багата часу, каб асвоіцца і падрыхтавацца да зімоўкі. Асенняя пасадка для маладой расліны — ужо сур'ёзнае выпрабаванне, нават пры ўкрыцці яна можа не перажыць зіму.

У той час як маліну чырвоную садзяць на адлегласці ў паўметра паміж кустамі, куманіку — 0,7 метра, маліне чорнай патрэбна не менш за метр, а расянікам, якія любяць раскідваць свае галінкі, можа не хапіць і двух. Выдатна, калі ў вас ёсць магчымасць пасадзіць гэтыя культуры і ў больш прыдатнае асяроддзе. Усё ж на адным месцы яны могуць жыць каля дзесяці гадоў. Пры загушчаных пасадках ягады на кустах будуць не так хутка выспяваць, а ў даждлівае надвор'е пашкоджвацца шэрай гніллю. І найлепшая прафілактыка тут — прарэджванне куста. Трэба выдаляць непатрэбныя, слабыя, неразвітыя атожылкі, ад якіх ураджаю не дачакаешся.

Чаму б маліны не выкарыстаць як дэкаратыўны элемент на газоне: пасадзіць кусцікі, на якіх будуць спець ягады розных колераў?

Калі вам патрэбны вялікі ўраджай, зразумела — лепшы для пасадкі стужкавы спосаб. Калі ж у вас праблемы з зямлёй, можна зрабіць траншэю, пакласці туды ўрадлівую зямлю (важна загадзя вырашыць пытанні з глебай, знайсці перагной, пасеяць сідэраты).



Трэба ўлічваць, што маліна і калючая куманіка множацца каранёвымі атожылкамі і паступова будуць заваёўваць новыя тэрыторыі. Каб стрымаць распаўзанне маліны, людзі часам укопваюць шыфер і дахавае жалеза, але расліны з цягам часу могуць прабівацца і праз іх. Зразумела, ёсць сарты, якія даюць нямнога атожылкаў, але і ім патрэбна прастора. Таму выбірайце пад малінаы-ажыны такія месцы, дзе раслінам будзе камфортна і дзе вы ім будзеце рады.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

## Які вакзал найпрыгажэйшы?

**Беларуская чыгунка падвяла вынікі штогадовага рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання чыгуначных вакзалаў.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, сярод пазакласных першае месца заняў вакзал станцыі Брэст-Цэнтральны. Ён уваходзіць у лік помнікаў архітэктуры Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца дзейным «музеем мармуру пад адкрытым небам». У маі бягучага года яму споўнілася 132 гады. Другое месца прысуджана вакзалу станцыі Мінск-Пасажырскі.

Сярод вакзалаў I класа першае месца прысуджана вакзалу станцыі Орша-Цэнтральная, на другім — вакзал станцыі Гродна. Сярод вакзалаў II класа перамогу атрымаў вакзал станцыі Полацк, другая прэмія прысуджана вакзалу станцыі Пінск. Пераможцам сярод вакзалаў III класа прызнаны вакзал станцыі Крычаў, другая прэмія дасталася вакзалу станцыі Лунінец.

Упершыню такі штогадовы конкурс адбыўся ў 2001 годзе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Нечаканыя госці

## У Беларусі трава смачнейшая?

### Цэлы статак кароў прыйшоў з Украіны ў Столінскі раён

**178 рагуляў з суседняга ўкраінскага сельгаспрадпрыемства прыйшлі праз мяжу на пашу ў Столінскім раёне ў нядзелю вечарам. Ці то пастухі ў прамым сэнсе праспалі, ці то каровы ў адзін момант захацелі пакаштаваць замежнай травы і хуценька пабеглі на беларускі бок, цяпер невядома. Толькі памежны нарад аператыўна заўважыў факт нелегальнага пераходу мяжы жывёлай у напрамку Гарадзішча — Ніжні Церабяжоў.**

Пакуль каровы елі траву і знаёміліся з беларускімі рагулямі («нелегалы» хутка змяшаліся са столінскім статкам), вартавыя мяжы праінфармавалі сваіх калег і вызначылі план дзеянняў.

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Пінскага пагранатрада Міхаіл БУТ-ГУСАІМ**, на наступны дзень у рамках рабочай сустрэчы пасля выканання пэўных памежных фармальнасцяў кароў забралі іх гаспадары. Дарэчы, гэта не першы выпадак, калі буйная рагатая жывёла з суседняй краіны прыходзіць на Століншчыну. Гады два таму мяжу перайшлі 38 украінскіх кароў. Тады іх таксама перадалі суседзям.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## Извещение о проведении 3 октября 2018 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Здание административно-бытового корпуса с ремонтным цехом» общей площадью 1680,9 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-56395), в том числе забор ж/б (инв. № 2002039), ограждение склада металла с воротами металлическими (инв. № 2002080), сетчатый забор на металлических столбах (инв. № 2002081), ворота раздвижные с переносной автоблокировкой (инв. № 4255494); «КПП» общей площадью 28,3 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62092); «Ангар № 2» общей площадью 439,8 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62093); «Ангар № 3» общей площадью 545,2 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62094), в том числе навес (инв. № 1002071); «Хозяйственно-бытовая канализационная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018641); «Ливневая канализационная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018644); «Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018643); «Тепловая сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018645); кабельные сети электроснабжения (инв. № 3000936); электротельфер (инв. № 4255331); тельфер электрический (инв. № 4255417); кран-балка (инв. № 4255501); лестница (инв. № 4255502); электротельфер (инв. № 4255530); стеллажи (инв. № 7018583); кран-балка, 14 м (инв. № 4255320) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Инженерная, 4Б, 4Б/1, 4Б/2, 4Б/3 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,8651 га, кадастровый номер 500000000002008803 |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 1 224 139,91 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 122 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования объектов недвижимости с Мингорисполкомом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации» |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 3 октября 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.09.2018 по 01.10.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о снятии с аукциона по продаже имущества ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», назначенного на **09.10.2018 в 12.00,** следующих лотов: **лот № 41**. Шкаф ШДК-5907 (станция), инв. № 144963. **Лот № 45.** Оборудование навесное снегоочистителя фрезерно-роторного ОФР-200, инв. № 145035. **Лот № 46.** Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier», инв. № 145058. **Лоты №№ 47–81.** Станок ткацкий СТБ-2-180, инв. №№ по факту, 35 штук. **Лот № 83.** Электроводонагреватель ЭВПЗ-15, инв. № 145047. Контактный тел. (0212) 47-20-56, e-mail: vcm74@mail.ru

УНП 390477566

Утерянный штамп № 35 ОАО «Стройтрест № 35» филиала ПМК № 1, УНП 100345786, **считать недействительным.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 412/С-8708 (назначение – здание блокированного жилого дома, назначение – жилой дом), обшей площадью 97,3 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Лунненский с/с, д. Подбораны, 44 (доля в праве 1/2)

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424082708601000050, площадью 0,2246 га (назначение – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)), расположенном по адресу: Мостовский р-н, Лунненский с/с, д. Подбораны, 44. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 4.1, площадь – 0,2246 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 13.2, площадь – 0,0044 га (доля в праве 1/2)

Начальная цена продажи – 2 585,78 руб. (две тысячи пятьсот восемьдесят пять рублей семьдесят восемь копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 258 руб. (двести пятьдесят восемь рублей)

Продавец – ОАО «Черлена», 231606, д. Лунно, пл. Героев, 4, тел. 8-01515-281-25

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 8 октября 2018 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

